Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

КРАСАВІК 29 АЎТОРАК № 17 (516) 1941 год ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР



І. В. СТАЛІН, акварэль. Партрэт работы мастака-ордэнаносца, засл. дзеяча мастацтваў БССР **В. Волкава**, зроблены для Вярхоўнага Совета БССР.
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

Лозунгі к 1 Мая 1941 года

1. Няхай жыве 1-е Мая—баявы агляд рэвалюцыйных сіл рабочага класа! Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

2. Братам па класу, вязням капітала, барацьбітам за вызваленне рабочага класа ва ўсім свеце—наша брацкае прывітанне!

3. Умацуем інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам капіталістычных краін! Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

4. Няхай жыве знешняя палітыка Совецкага Ўрада, палітыка міру паміж народамі і забеспячэння безапаснасці нашай радзімы!

5. Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія—магутны аплот мірнай працы народаў СССР, верны страж заваёў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі!

6. Працоўныя Совецкага Саюза! Не забывайцеся аб капіталістычным акружэнні! Будзем няўхільна ўмацоўваць нашу Чырвоную Армію і нашу соцыялістычную разведку — ВЧК!

7. Няхай жыве Ваенна-Марскі Флот Совецкага Саюза—надзейная ахова совецкіх марскіх граніц!

8. Няхай жыве магутная совецкая авіяцыя! Няхай жывуць совецкія лётчыкі—гордыя сокалы нашай радзімы!

9. Прывітанне мужным і бясстрашным байцам-пагранічнікам, пільным вартавым краіны соцыялізма!

10. Няхай жыве брацкі саюз і дружба народаў Совецкага Саюза!

11. Стаханаўцам прамысловасці, транспарта, гандлю і сельскай гаспадаркі, знатным людзям нашай краіны — большэвіцкае прывітанне!

12. Даб'ёмся выканання і перавыканання гаспадарчага плана 1941 года — чацвертага года трэцяй пяцігодкі!

13. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі! Змагайцеся за штодзённае выкананне плана ў кожным цэху, у кожнай брыгадзе, на кожным станку і ў кожнай змене!

14. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі! Змагайцеся за культуру на вытворчасці, за чыстату і парадак у прадпрыемствах і на транспарце!

15. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі! Рухайце наперад новую тэхніку, быстрэй асвайвайце вытворчасць новых машын, матэрыялаў і вырабаў!

16. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі чорнай і каляровай металургіі! Змагайцеся за павелічэнне вытворчасці метала, за яго якасць!

17. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі машынабудаўнічай прамысловасці! Змагайцеся за развіццё самага перадавога ў свеце машынабудаўніцтва!

18. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі абароннай прамысловасці! Мацуйце абаронную магутнасць нашай радзімы! Узбройвайце Чырвоную Армію і Ваенна-Марскі Флот навейшай тэхнікай!

19. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі паліўнай і энергетычнай прамысловасці! Большэвіцкімі тэмпамі рухайце наперад здабычу паліва і вытворчасць электраэнергіі! Умацоўвайце паліўную і энергетычную базу СССР!

20. Работнікі хімічнай прамысловасці! Змагайцеся за стварэнне магутнай хімічнай прамысловасці нашай краіны!

21. Таварышы будаўнікі! Змагайцеся за паскарэнне тэрмінаў будаўніцтва, за патаненне і высокую якасць будоўляў!

22. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці! Больш паркалю, шоўку, сукна, трыкатажа, абутку, адзення для грамадзян Совецкай краіны! Змагайцеся за высокую якасць прадукцыі!

23. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі чыгуначнага і воднага транспарта! Змагайцеся за выкананне і перавыкананне дзяржаўнага плана перавозак! Паляпшайце работу совецкага транспарта!

24. Барацьба з прагульшчыкамі і дэзарганізатарамі вытворчасці ёсць барацьба за ўмацаванне магутнасці нашай радзімы і яе Чырвонай Арміі. Няхай жывуць працоўная дысцыпліна і ўзорны парадак на прадпрыемствах нашай радзімы!

25. Усямерна разаўём мясцовую прамысловасць і прамысловую кааперацыю! Павялічым вытворчасць тавараў шырокага спажывання з мясцовай сыравіны!

26. Створым магутныя дзяржаўныя працоўныя рэзервы для прамысловасці і транспарта!

27. Калгасная і гарадская моладзь! Ідзіце ў школы фабрычна-заводскага абучэння, рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы! Рыхтуйцеся стаць кваліфікаванымі работнікамі нашай радзімы!

28. Калгаснікі і калгасніцы! Змагайцеся за ўзорнае завяршэнне веснавой сяўбы, за высокія ўраджаі і ўздым грамадскай жывёлагадоўлі! Умацоўвайце грамадскую гаспадарку калгасаў! Няхай жыве заможнае і культурнае жыццё калгасаў!

29. Служачыя совецкіх устаноў! Змагайцеся за ўмацаванне дзяржаўнай дысцыпліны, за дакладнае выкананне совецкіх законаў!

30. Работнікі дзяржаўнага і кааператыўнага гандлю! Змагайцеся за лепшае абслугоўванне совецкага спажыўца, за культурны совецкі гандаль у горадзе і вёсцы!

31. За далейшы росквіт соцыялістычнай культуры народаў СССР, за новыя поспехі і заваяванні совецкай навукі, тэхнікі, мастацтва!

32. Няхай жыве роўнапраўная жанчына Совецкага Саюза — актыўная ўдзельніца ў кіраванні дзяржавай, гаспадарчымі і культурнымі справамі нашай краіны!

33. Выхаванне ўсёй масы членаў профсаюзаў у духу ленінізма — пачотны доўг совецкіх профсаюзных арганізацый! Няхай жывуць совецкія профсаюзы — школы комунізма!

34. Разгорнем крытыку нашых недахопаў! Умацуем яшчэ больш магутнасць і арганізаванасць нашай дзяржавы!

35. Няхай жыве комсамол — верны памочнік большэвіцкай партыі! Няхай жыве совецкая моладзь — будучыня нашай радзімы!

36. Навучаючыяся совецкай школы! Авалодвайце навукай, рыхтуйцеся стаць барацьбітамі за справу Леніна — Сталіна!

37. Дзеці — наша будучыня. Выхаваем совецкіх дзяцей патрыётамі нашай радзімы, гатовымі прадаўжаць барацьбу за справу Леніна—Сталіна!

38. Фізкультурнікам і фізкультурніцам Совецкай краіны — наша гарачае прывітанне!

39. Няхай жыве і мацнее наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

40. Няхай жыве наш рабочы клас!

41. Няхай жыве наша калгаснае сялянства!

42. Няхай жыве наша, совецкая, інтэлігенцыя!

43. Няхай жыве Ўсесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў — перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

44. Няхай жыве Комуністычны Інтэрнацыянал — арганізатар барацьбы за перамогу працоўных!

45. Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна! Няхай жыве ленінізм!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай Партыі (большэвікоў).

Першае мая

Больш поўвека рабочыя ўсіх краін штогод святкуюць 1 Мая — дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці. У гэты дзень працоўныя ўсяго свету дэманструюць свае рэвалюцыйныя сілы, сваю гатоўнасць да барацьбы за вызваленне ад капіталістычнага рабства, за знішчэнне эксплаатацыі чалавека чалавекам, за волю, шчасце і радасць чалавецтва.

Першае мая ў гэтым годзе працоўныя масы капіталістычных краін сустракаюць у выключна складанай і напружанай міжнароднай абстаноўцы, калі на трох кантынентах разгараецца другая імперыялістычная вайна.

Цяперашняя вайна, распачатая драпежнымі імперыялістамі, вядзецца «за гегемонію ў Еўропе, за каланіяльным уладанні ў Афрыцы і ў другіх частках свету, за нафту, вугаль, жалеза, каучук, а зусім не за абарону «дэмакратыі», «свабоды», «міжнароднага права» і забеспячэнне незалежнасці малых краін і народаў, як крычыць буржуазны друк і соцыял-дэмакратычныя падманшчыкі рабочага класа» (Дзімітраў).

Надыходзячая вясна зусім не абяцае звужэння вайны, а, наадварот, яе значнае пашырэнне. Капіталісты ўсіх краін і іх урады прыкладваюць усе намаганні да таго, каб вайна разраслася ў сусветную, з мэтаю абагачвання і нажывы за кошт дзікай эксплаатацыі шырокіх працоўных мас.

У іншых умовах сустракаюць 1 Мая ў 1941 годзе працоўныя СССР. Наша краіна, дзякуючы мудрай сталінскай міжнароднай палітыцы, знаходзіцца па-за вайной. Аднак народы Совецкага Саюза добра памятаюць і не забываюць указанняў вялікага Сталіна аб капіталістычным акружэнні і заўсёды знаходзяцца ў мабілізацыйнай гатоўнасці. Геройчная Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот, увесь совецкі народ у любы момант гатовы даць сакрушальны адпор ворагам першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы.

Рабочы клас, сялянства, інтэлігенцыя СССР з дня ў дзень мацуюць магутнасць нашай радзімы, з кожным днём памнажаючы поспехі ў галіне эканомікі і культуры соцыялістычнай радзімы якая ператвараецца ў непрыступную крэпасць соцыялізма.

Цяпер наш народ, узброены рашэннямі XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б), разгарнуў велізарнейшую творчую работу, вырашае гістарычнай важнасці праблему —здагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах.

У 1941 годзе народы СССР вядуць барацьбу за давядзенне выпуску валавой прадукцыі прамысловасці да 162 мільярдаў рублёў; за будаўніцтва 2.955 новых і пашырэнне існуючых прамысловых прадпрыемстваў; за выплаўку 18 мільёнаў тон чыгуну, 22,4 мільёна тон сталі, 15,8 мільёна тон пракату; за здабычу 191 мільёна тон вугалю, 38 мільёнаў тон нафты з газам, 39 мільёнаў тон торфу, за збор 7,9 мільярда пудоў зярна. Выпаўненне гэтага плана дасць магчымасць яшчэ больш павысіць матэрыяльны і культурны ўзровень совецкага народа.

Вялікі з'едданы беларускі народ будзе разам з другімі народамі СССР весці барацьбу за выпаўненне плана 1941 года, за ўмацаванне абароннай магутнасці нашай краіны. Геройчны беларускі народ будзе весці барацьбу за выпаўненне гістарычнага рашэння ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб асушцы балотаў. У бліжэйшыя пятнаццаць год беларускі народ бяскроўна адвае ад балотаў тэрыторыю, роўную еўрапейскай дзяржаве, што падвоіць пасеўную плошчу БССР.

Літаратары Беларускай ССР у 1941 годзе будуць працаваць над падрыхтоўкай да 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, каб сустрэць гэту гістарычную дату манументальнымі творамі, вартымі вялікай ленінска-сталінскай эпохі.

Мастакі БССР дзейсна рыхтуюцца да Усесаюзнай выстаўкі «Наша радзіма» і да беларускай выстаўкі, прысвечанай 25-годдзю Вялікага Кастрычніка.

У нашых тэатрах у 1941 годзе вызначыўся паварот да совецкіх п'ес, гэта дасць магчымасць яшчэ вышэй падняць беларускае совецкае тэатральнае мастацтва. Кампазітары Совецкай Беларусі працуюць над новымі музычнымі творамі (оперы, сімфоніі і інш.), прысвечанымі 25-годдзю Вялікага Кастрычніка. Сярод працаўнікоў мастацтваў БССР наглядаецца нябачаны пад'ём, жаданне стварыць мастацкія творы, вартыя нашага геройчнага народа.

У дзень 1 Мая совецкі народ яшчэ раз прадэманструе сваю рашымасць не толькі выпаўніць, але і перавыпаўніць план 1941 года, каб яшчэ больш умацаваць нашу краіну.

Першага мая беларускі народ разам з усім совецкім народам прадэманструе сваё маральна-палітычнае адзінства і згуртаванасць навакол партыі Леніна—Сталіна, сваю гатоўнасць весці барацьбу за ўрачыстасць комунізма, сваю гарачую любоў і адданасць правадыру народаў СССР і ўсіх працоўных свету вялікаму Сталіну.

Няхай жыве 1 Мая—дзень баявога агляду сіл рэвалюцыйнага рабочага класа ўсяго свету!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя большэвікоў — перадавы атрад працоўных Совецкага Саюза!

Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна! Няхай жыве ленінізм!

Перадсвяточныя літаратурныя вечары

Беластоцкае аддзяленне ССП праводзіць рад літаратурных вечароў і выступленняў, прысвечаных сустрэчы міжнароднага свята Першага мая. Вылучаны тры брыгады, у якія ўвайшлі беларускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі, для выступленняў на прадпрыемствах горада.

У дні свята ў Беластоку будзе праведзен агульнагарадскі інтэрнацыянальны літаратурны вечар, у якім прымуць удзел паэты Максім Танк, Філіп Пестрак, Пімен Панчанка, Бінэм Гелер, Іосіф Рубінштэйн, І. Эміот, Д. Сфард, М. Кнапгайс, Елена Сэльм, Ю. Равіч і інш.

Беласток. (**Наш кар.**).



Мы па новаму плану
Асушаем балота,
Прымушаем балота
Нам расціць каучук,
Адзначаецца май
Сорак першага года
Дарагімі здабыткамі рук.

Вось, напрыклад, балота.
Што гэта такое?
Кожны знае, што скарб незлічоны,
А ўсё-ж
Паўтараю,
Што гэта руно залатое,
Хлеба тысячы цэнтнераў,
Мільёны галош.
Можна, нават, стварыць
З дапамогай навукі
Рэч такую складаную.
Як весялосць
І трывалае шчасце,
Былі-б толькі рукі
І жаданне тварыць,
Ну, а гэта ў нас ёсць.
Я недарам кажу,
Бо я чую штораніцы,
Як бадзёрымі крокамі
Мінскі будзячы дол,
Кніжкі, сшыткі нясуць,
Як паходныя ранцы,
Выхаванцы
Рамесленых школ.

Бачыў я і чыгуначныя
Рэзервы,
Тых, каму мы даверым
Праз год, праз другі
Тэрыторыі нашай
Жалезныя нервы,
Ці, дакладней гаворачы,
Зносін шляхі.
Пра майстроў сёння дбаюць
І пад матчыным дахам,
Вучню тому, што ўчора
Пакінуў свой дом,
Я наладзіць хацеў-бы
Паветраным шляхам
Пераклічку
З родным сялом.

Ён-жа помніць
Пра маці сваю, безумоўна,
Вось яму і раблю я
Паветраны мост,
Думкі маці і сына
Злучаючы ўмоўна
Пераклічкай праз сотні,
Праз тысячы вёрст.
Чалавек —
Гэта радыёстанцыя тая-ж,
Толькі больш складаная, бо
з цяглін
І крыві,
І працуе яна, і гудзе,
І пытае
На вялікай хвалі
Сардэчнай любві.

Будзе час і вучоны зробіць
Даклад нам
Пра тое, як змайстраваць
Апарат,
На якім запісваецца
Дакладна
Чалавечых, святочных пачуццяў
Парад.

Дык пачнём пераклічку ў эфіры
Сінім
У часы блакітных
Для маці хвілін;
Першамайскае
Салідарнасці з сынам
Мы пачнём пераклічку.
— Што робіш, сын?
— Я цяпер рыхтуюся
Да парада,
Выступаем...
Роўна праз пяць хвілін.
Сёння я спяганосцам.

— Я вельмі рада,
А якія поспехі маеш,
Сын,
Як працуеш, як вучышся?
— Як заўсёды.

— Што рабіў у выходныя дні?
— Хадзіў
Аглядаць з сябрамі будынкі,
Заводы...
— Што ты ўбачыў?
Што палюбіў?

— Маці! бачыў я лес
рыштаванняў
Бясконцы,
Рыхтаваліся,
Бачыў я, муляры,
Умываліся
Сталевары на сонцы,
Залатыя іх рукі бачыў я
На зары.
Залатыя іх рукі палюбіў я.
Да неба
Колькі новых за год узнялі яны
Труб,
Колькі фабрык, заводаў далі яны,
Хлеба
Краю вольнае працы,
Што змалку мне люб...
Вось што бачыў я, маці!

— Ты бачыў многа,
Вельмі многа,
Ты бачыў амаль што ўсё,
Вельмі рада...
— І гэта мая дарога.
— Вельмі рада.
— І ў гэтым маё жыццё.

Я таксама, таварышы,
Сын працоўнае маці.
Я таксама, таварышы,
Змалку прывык
Балоты асушаць,
Каб цвілі сенажаці,
Сталь выношваць, як домны,
Для шабляў і пік.
Мне таксама, таварышы,
Дыша эпоха
Аўтагеннай
Гарачаю працай у твар,
Кінь, кажу я, натхненне,
Спадзявацца на бога,
Не паэнiся,
Здавай у друкарню тавар.

Па расплаўленай сталі
Вымярайце і мерце
Пафас свой, першаякасны гарт
свой,
Радкі,
Толькі ў справах гарачых
Куецца бяссмерце,
Але, зрэшты, аб гэтым
Падбаюць вякі.

Наш кірунак гарачы,
Чалавеку выгодны,
І калі аб жыцці сваім
Думаць як след, —
Кожны з нас, хто працуе,
Ужо тым бессмяротны,
Што на гэтай дарозе
Пакінуў свой след.

Перад блізкаю мэтай
Мы сілы збіраем,
У адзіную сілу,
Як сказаў-бы паэт,
Бо прышла ўжо, прышла ўжо
Такая пара ім
Развінуць свае плечы
Перад тварам вайны,
Свае сілы мы двойчы і тройчы
Памножым
І збярэм іх,
На цэлы сусвет.
Гатовыя да атак,

Перад тварам вайны,
Перад тварам варожым
У ваенны
Рабоча-сялянскі кулак.

Як яго мы над станам варожым
Узнымем,
У каго задрыжыць пад нагамі
Зямля,
Хто канкрэтна загіне?
. . . . . .
З такім-жа уздымам
Падрабязна
Раскажам аб гэтым пасля.

Мінск, 1941.

Насустрач 1 Мая. Джазаркестр клуба станкабудаўнічых заводаў імя Варашылава і імя Кірава (Мінск) рэпетыруе першамайскі рэпертуар.
Фота І. Брэйво (БЕЛТА).

Б. Марк

Аб стылі, аднабокасці паказу і героях

Пра некаторыя пытанні польскай літаратуры Беларусі

1940 год у жыцці і творчасці кожнага з польскіх пісьменнікаў з'еднанай Совецкай Беларусі быў бясспрэчна пераломным, глыбока перажытым. У гэтым годзе кожны з пісьменнікаў адчуў, што і яму дадзена быць — праз сваю скромную творчасць — адным з першых стваральнікаў новай польскай літаратуры.

Польскія пісьменнікі Беларусі прыступілі да паказу ў апавяданнях, аповесцях, радзей у вершах і драматычных творах, карцін белапанскай Польшчы, карцін нечуванага патрасення ў жыцці польскага народа, карцін вызваленчага паходу Чырвонай Арміі і пачатковых працэсаў пабудовы ў вызваленых абласцях БССР соцыялізма.

Група польскіх пісьменнікаў Беларусі—група маладая. Належаць да яе пісьменнікі вельмі маладыя, якім падзеі 17 верасня 1939 года далі магчымасць нармальнай творчай працы. Яны ўжо мелі пачатковы вопыт творчай працы, але ва ўмовах рэжыму Пілсудскага ў іх не было перспектыў для росту. Цэнзурныя ўмовы былой Польшчы былі прычынай выпрацоўкі туманнага стылю, поўнага недагаворак, сімвалічных зваротаў, закансціпіраваных метафар, з дапамогай якіх удавалася абмінуць рагаткі цэнзуры. У некаторых пісьменнікаў гэты стыль з часам увайшоў у кроў, стаў творчай манерай. Частка з іх і цяпер, калі можна ўжо на поўныя грудзі дыхаць, калі можна поўна разгарнуць паказ рэчаіснасці — як нядаўна мінулай, так і сучаснай, — не можа адразу вызваліцца ад гэтых стылістычных адзнак, якія часам незразумелы і нават надаюць творам непатрэбную двухсэнсовасць.

Барацьба з гэтымі недахопамі стылю—справа тым больш пільная, тым больш важная, што яны з'яўляюцца пэўнай традыцыяй у польскай літаратуры, традыцыяй «жэромшчыны»; гэтыя стылістычныя асаблівасці мы сустракаем і ў творах польскіх пісьменнікаў Беларусі — у «Некралогу» К. Ансэльма, у некаторых навелах Елены Сэльм, у першых спробах Валенціны Найдус. Пераўвялічаная залішне метафара, якая часам мае штучнае гучанне, з'яўляецца часта ў вершах Т. Главацкага.

Некаторыя нашы маладыя пісьменнікі знаходзяцца яшчэ пад уплывам выхавання, набытага ў варшаўскіх дробнамяшчанскіх літаратурных колах, і мяркуюць так, што стыль ёсць толькі адзенне для думкі, што стыль ёсць толькі пэўны знешні сродак, бадай ці не тэхнічны. А стыль-жа ёсць выяўленне ідэалогіі аўтара! Туманнасць, ужыванне мноства неістотных дэталей, «паэтызіраванне» мовы з дапамогай псеўдаімпрэсіі «чуллівых» слоўцаў запямняюць думку і запямняюць тым самым ідэйнае аблічча аўтара. Тым больш, што гэта стылістычная туманнасць спалучаецца нярэдка з іншай, яшчэ не зусім пераможанай рэшткай пэўнага кірунку ў грамадскай літаратуры былой Польшчы—з аднабокасцю паказу рэчаіснасці, а асабліва сучаснасці.

Малюючы рэчаіснасць капіталістычнай Польшчы, пісьменнікі часта забываюць, што рэчаіснасць гэта мае два бакі, плыве двума струменямі, што яна — не толькі нечуваная эксплаатацыя працоўных мас, не толькі галеча, зневажанне і цемрадзь, насаджаныя кучкай прывілегіраваных людзей. Пісьменнікі не паказваюць у сваіх творах светлых плям на шэрым, альбо спрэс чорным фоне, не паказваюць другой праўды ўчарапняга жыцця: бунту пралетарыя, інтэлігента, селяніна супроць гэтай агіды жыцця, не паказваюць радасці барацьбы за лепшае заўтра, глыбокіх чалавечых пачуццяў, якія былі ў зняважаных, у лахманы адзетых. Часта пісьменнікі ў сваіх апісаннях трацяць і пачуццё меры, і гістарычную перспектыву.

Вось гэта аднабокасць цягнецца яшчэ і ў некаторых апавяданнях Елены Сэльм, і ў навеле А. Дэгаля «Нурмі», і нават у навелах наогул ураўнаважанай Ганны Дабжынскай.

З гэтай аднабокасцю паказу рэчаіснасці спалучаецца трэцяе пытанне,—пытанне героя, галоўнага персанажу ў творах нашых маладых пісьменнікаў. Герой канфіскаванай у Польшчы аповесці Ансэльма «Некралог» Згрзыт не мог быць персанажам станоўчым, здаровым, цэльным. Згрзыт—гэта персанаж, у якім змагаюцца паміж сабою ідэі, у якім нараджаецца грамадская свядомасць, але гэты персанаж маральна знявечаны, незакончаны, лёс Згрзыта перарваны пасярод дарогі. Згрзыт як-бы павіснуў у паветры, ён убірае ў сябе чырвонасць лунаючага чырвонага сцягу, але ў гэту постаць жыццё ўклала столькі агідных прыгод, што мы ледзь верым, што Згрзыт мог без вялікіх перажыванняў, без унутраных патрасенняў увайсці ў новае жыццё.

Інакш выглядаюць душэўныя якасці герояў у п'есе, якую цяпер піша Ансэльм. Маладая польская настаўніца, удава, абаронца Мадрыда, і беларускі камсамолец—гэта не толькі новыя людзі з рэчаіснасці заходніх абласцей, гэта не толькі новыя персанажы ў польскай літаратуры, — гэта тыпы, у рэалізаванні якіх аўтар можа ўзняцца да ролі не звычайнага паказчыка жыцця, а да ролі сутварца новых форм жыцця.

Нельга яшчэ сказаць гэтага пра персанажы новых навел Дэгаля «Нурмі» і «З вакна гасцініцы». Ці Леон Заяц—меланхолік, а потым вар'ят—сапраўды носьбіт ідэі навелы «Нурмі», ідэі аб гніласці, аб нутраным разлажэнні сям'і дробнамяшчанскіх дзяльцоў? Ці тое, што напаткала Леона Зайца, а іменна страта розуму, ёсць носьбіт унутранага раскладу сям'і Зайца? Тым больш, што аўтар звяртаецца да залішняга псіхалагізіравання, траціць пачуццё меры ў маляванні няшчасцяў, якія падаюць на галаву вар'ята, і адрывае матывы і падзеі навелы ад асяроддзя, ад часу, ад грамадскіх умоў Зайцаў. Тым больш, што аўтар і надалей трымаецца свайго няслушнага погляду на дробнае мяшчанства, як на адзіную масу піратаў і дэгенератаў, — погляду, які пачаўся ў Дэгаля ў яго першай аповесці «Конквістадары з Боніфратэрскай вуліцы», аповесці наогул таленавіта напісанай.

Ці будуць персанажы новай аповесці, над якой Дэгаль цяпер працуе, героямі нашага часу? Заўчасна будзе яшчэ адказваць на гэта пытанне. Залежыць гэта ад таго, наколькі ўдасца Дэгалю утрымаць свой даўні ўраўнаважаны стыль, які дапамагаў пранікаць у душу герояў.

Герояў нашай рэчаіснасці як нашых, совецкіх дзён, так і жыцця за кардонам, шукае і намагаецца паказаць Елена Сэльм. Але і яна ўпадае ў аднабокасць, якая мяжуе з натуралізмам, альбо ў аднабокасць лёгкага вырашэння пытанняў новага жыцця. Лепшае апавяданне Сэльм — «Нямы Моўша» з жыцця Варшавы. Моўша — чалавек знявечаны, чалавек, які баіцца жыцця, людзей, свету, гэта фізічны і духоўны карлік. І гэты нямы Моўша, пасмешышча вуліцы, становіцца раптам на чале натоўпу, які нападае на паліцыю. А, з другога боку, апавяданні Сэльм аб першых працэсах у новым жыцці заходніх абласцей—«Першая вясна», «Анастасья»—ідуць па лініі найменшага супрацiўлення ў паказе рэчаіснасці, яны не маюць ніякіх канфліктаў, не відаць у іх барацьбы.

1940 год, бясспрэчна, быў пачаткам пазбаўлення польскімі пісьменнікамі туманнасці стылю, аднабокасці паказу рэчаіснасці і нетыповасці галоўных персанажаў, герояў. Не толькі новыя творы Ансэльма, Дэгаля і Сэльм (аповесць «Бунт») паказваюць новых людзей. Персанажы першых навел Дабжынскай, яе Янова, яе Мар'я і Юзеф—гэта таксама афяры капіталізма, але не карлікі, не знявечаныя душы, — яны прадстаўнікі пралетарыята, у якіх нарастае класавая нянавісць, нараджаецца бунт. Персанажы апавяданняў Валенціны Найдус—персанажы, акрэсленыя яшчэ не зусім упэўненай рукой, але гэта людзі нашай эпохі, тварцы новага жыцця, гэта стаханаўцы, свядомыя рабочыя.

Найдус і Сэльм да гэтага часу з'яўляюцца выключэннем. Ніхто, акрамя іх, не паказаў яшчэ ў сваіх творах совецкай сучаснасці. Толькі заключны акорд аповесці Я. Бранеўскай «Вандроўкі меднага грошыка» гучыць сучасным тонам, але гэта хутчэй сімвалічны паказ совецкага жыцця праз рост новага будынка, над якім лунае чырвоны сцяг свабоды.

Аднак, да паказу совецкай рэчаіснасці звернута ўвага шмат якіх аўтараў. К. Ансэльм закранае ў сваім новым творы пытанні выхавання дзяцей. А. Дэгаль намерваецца прывесці сваіх герояў у Заходнюю Беларусь, Я. Бранеўская прагне аздобіць сваю Бальбіну піонерскім гальштукам, Е. Сэльм разгортвае частку падзей аповесці «Бунт» на вызваленай зямлі.

Выкананне гэтых намераў у значнай ступені залежыць ад таго, ці здолеюць пісьменнікі не толькі паказаць правільную карціну рэчаіснасці, але і ці ўбачаць яны тэндэнцыі нашага развіцця. Залежыць яно і ад таго, наколькі здолеюць пісьменнікі развязаць тыя канфлікты, якія адбываюцца яшчэ ў працэсе будавання новых вытворчых дачыненняў і новага чалавека. У праціўным выпадку нашай маладой літаратуры пагражае нейкі неосантыменталізм. А выпадкі такія былі—і не толькі ў прозе, але і ў паэзіі.

Справы паэзіі ў польскай літаратуры Беларусі—пытанне да таго асаблівае, што... яно перастала, як пытанне, існаваць. У першыя месяцы пасля вызвалення кожны, бадай, польскі пісьменнік пісаў вершы. Былі гэта спробы.

У пачатковых спробах паэтаў выявіліся дзве стылістычныя лініі, якія адразу паказалі, што наша маладая паэзія ўступае на фальшывую дарогу. З аднаго боку—нейкі своеасаблівы неосантыменталізм і саладжавы псеўдапафас. Паэма Юрыя Равіча «Бездань і сонца» складаецца з двух частак. Першая частка—гінучая Варшава, кроў і голад. У гэтай частцы Равіч аперыруе мастацкімі вобразамі. Затое другая частка—голыя словы, рыфмаваная публіцыстыка аб вызваленні, поўная саладжавых тонаў і сантыментальнага псеўдапафасу.

Некалькі вышэй стаяць першыя совецкія вершы Елены Сэльм і Тэафіля Главацкага. Але і ў іх пануе саладжавасць, няма ў іх узрушаючага пафасу. Адчуваецца ў іх недахоп мастацкіх сродкаў для выяўлення новых пачуццяў.

З другога боку, новыя вершы А. Дэгаля трапілі ў нейкае адзервяненне слова, у сухасць.

Іншых вершаў—не саладжавых і не сухіх — нашы паэты яшчэ не далі.

Польская проза Беларусі выходзіць з першага спробнага кругабегу, адкідае ўсё памылковае і ўступае на шлях сапраўднага творчага росту.

Першая лекцыя

Вялікую зацікаўленасць выклікала ў пісьменнікаў і работнікаў мастацтва Беластока лекцыя сакратара абкома партыі тав. Эльмана на тэму «Марксісцка-ленінскае вучэнне аб мастацтве».

Гэтай тэмай 24 красавіка пачаў сваю сталую работу лекторый, арганізаваны пры Беластоцкім Доме пісьменніка, які будзе працаваць штотыднёва.

Беласток. (Наш. кар.).

Максім Танк

На балотах

Такі быў дзіўны гэты дзень!
Снег
 уцякаў з палёў,
і першым у калгасе дзед
пачуў гасцей-шпакоў.
Ну і дакучыў кожнаму:
склікаць задумаў сход,
што на шпакоўніцы яму
не вызначылі фонд.
А тут яшчэ —
 каля паўдня
пагнала крыгі з плёс,
з раёна весткі старшыня
з газетамі прывёз,
што балатам ужо канец,
пачнём іх асушаць;
што будзе там, дзе рос куглец —
зямля і сенажаць;
Што паглыбее Шыпаўка
і дасца спад вадзе...
Рашэнне паказаў Цэка
у «Правде»
 і ў «Звяздзе»...
Хоць азарыла як святлом
такая вестка ўсіх,
але сумненне заскрабло
патыліцы ў старых.
Ды што за дзіва!
 Глыб і мох —
дрыгвою гэтай век
прайсці адважыцца не мог
ні звер, ні чалавек.
Казалі:
 некалі з лазы
чорт звіў сабе гняздо
і на балоце гэтым жыў,
акружаны вадой.
Начамі зелле ён курыў
і спавіваў тады
людзей
 і нівы,
 і бары
імглы атрутнай дым...
Было пагутарыць аб чым
у гэты дзень і час.
І толькі каля поўначы
сон атуліў калгас.

Заходні вецер хмары гнаў,
на грэблі вербы гнуў.
Дажджамі-ліўнямі вясна
зямлю будзіла з сну.
Бы адчуваючы рака,
што больш ёй не гуляць,
што чалавечая рука
яе можа ўкілзаць, —
з размытых выйшла берагоў
на шыр,
 на балаты,
і хвалі стадамі ваўкоў
пайшлі на стары тын.
Паводка ахапіла даль,
палі, калгасны сад.
Пакуль збудзілся — вада
ламала
 дзверы хат.
Набату пракаціўся гул.
І ў ноч,
 як ў цёмны бор,
пайшлі брыгады па лугу
на ледзяны затор.

На павароце Шыпаўкі
ўзняліся горы крыг
і хвалі ўспененай ракі
ўзрываліся
 на іх.
Сабраўся адусюль народ.
І аж пад самы дзень
пры смалякох ламалі лёд
па пояс
 у вадзе.
Калі-ж разгневаны прыліў
адкінуў ўсіх назад, —
пантоны выплылі з імглы
на помач.
 Лейтэнант
сапёрам даў загад ўзарваць
глыб ледзяных затор.
І ўзрывы ўскалыхнулі гаць
і балатоў прастор.
Па гібкіх лозах, сасняках
гул пракаціўся на'т
і пераможаная рака
кранулася
 на спад.

Плылі разбітыя плыты,
карэнне, буралом,
жардзё, сарваныя платы,
балотных пуняк лом.
— Пара варочацца-б дамоў! —
напомніў старшыня,
на жар падкінуў смалякоў,
стаў грэцца ля агня.
Ды не хацелася і ўсім
з-над берагу ісці.
Пахучы рассцілаўся дым
па леташнім трысці.
Схіліўшыся,
 рачную сінь
пілі галіны дрэў.
З пантонаў вецер данасіў
хвалюючы напеў —
пра мудрага правадыра,
пра край радзімы свой...
І загарэлася зара
над песняй,
 над зямлёй.
— Што-ж думаць! — кажа
 старшыня. —
Сабраўся ўвесь народ,
і, каб не змарнаваць паўдня,
на месцы зробім сход.
Раз абвясцілася вайна,
ў паход усіх завуць, —
пара узброіцца і нам,
узяцца за дрыгву.
Ўжо досыць гніль,
 іржа балот
атручвала гады,
ў смяротнай пошасці сухот
душыліся дзяды!
Каўтун і вечная імгла
не сходзілі з імшар,
і твань галодная ўзяла,
ўсмактала шмат афяр.
Больш не падымуць галавы
былога здані тут,
калі пралажацца равы,
аздаравіцца грунт!..
Ледзь золак, выплыўшы з балот,
на стрэхі
 ападзе, —
збіраецца, ідзе народ
на працу кожны дзень.
Блішчаць лапаты, тапары,
хор галасоў звініць,
сцяг над калонамі ўгары
хвалюецца, шуміць.
І калі вецер расхіне
палотнішча,
 на ім
зазяюць лозунгі ясней
пад сонцам залатым:
«Абавязацельства даём —
за сорак першы год
брыгадай асушыць сваёй
больш дзвесце га балот!»
І закіпела з гэтых дзён!
Пабачыш, дзе ні глянь,
як маладзее ўсё жыццё,
як будзіцца зямля.

Зямля!
 Я сотні раз прайшоў
па роднай старане,
прастор і даль тваіх шляхоў
даўно знаёмы мне.
Чуў, як у цемры векавой
стагнала ты ў ярме,
і ўсходы руні маладой
касіла градам смерць.
Я межы бачыў, на якіх
нядолі рос асот,
муры астрожныя
 і ў іх
зняволены народ.
На курганах і ўсюды быў,
дзе хмараў цень лягла,
дзе толькі песня барацьбы
адна дайсці магла.
Таму прастор калгасных ніў,
свабодная зямля,
і нашы сонечныя дні
век славіць буду я.

І як не пець,
 калі вясну,
што растапіла снег
і ажывіла старану,
сустрэць прыйшлося мне.
Сустрэць —
 не схіленай сасной
над польным курганом,
не адзвінеўшаю струной
і на'т не старыком.
Зрок ясна бачыць прад сабой
шляхоў і рэк узор,
над маўзалеем,
 над зямлёй
праменне вечных зор.
І голас гулкім серабром,
пяеш — звініць ў далі, —
ў трэль салаўіную,
 ці ў гром,
ў любую песню лі.
Яна скупаецца ў жытах
высокіх і густых,
дзе некалі на балатах
шумелі
 чараты.

18. IV. 1941.

НОВЫ СКЛАД РЭДКАЛЕГІЙ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІХ ЖУРНАЛАЎ


Праўленне ССП БССР зацвердзіла новы склад рэдкалегій літаратурна-мастацкіх журналаў.

Рэдкалегія «Полымя рэволюцыі»: рэдактар — П. Броўка, члены рэдкалегіі: Янка Купала, Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Міхась Клімковіч і Філіп Пестрак.

Рэдкалегія «Штэрна»: рэдактар — І. Эрэнгрос, члены рэдкалегіі: І. Шляфер, Г. Цырлін, Сара Каган, Б. Геллер і Д. Рыхтэр.

Пісьменнікі за работай. Нядаўна прыняты кандыдатам у члены КП(б)Б паэт-ордэнаносец **Пятро Глебка** працуе над п'есай да 25-годдзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. П'еса, задуманая як частка драматургічнай трылогіі на тэму аб утварэнні БССР, адлюстроўвае ролю Леніна, Сталіна і Свердлава ў стварэнні беларускай дзяржаўнасці.

На здымку: тав. **Глебка** ў сваім рабочым кабінеце.



Фота І. Каплінскага.

Ю. Віцьбіч

Гістарычная тэматыка і пісьменнікі

«Але калі падвялі яго к апошнім смяротным мукам, здавалася, нібы стала падавацца яго сіла... І падупаў ён сілаю і ўсклікнуў у душэўнай знямозе:

«Бацька! дзе ты? ці чуеш ты?»

«Чую!» пачулася сярод усеагульнай цішы, і ўвесь мільён народа адначасна ўздрыгнуў».

Н. В. Гогаль. «Тарас Бульба».

Там, дзе зліваюцца разам Сож і Проня, ляжыць на стромкім беразе стары Прапойск. За даўнейшыя часы тут жылі славутыя былінныя багатыры-волаты на чале з кавалём Ірвідубам. І тут жыве вядомы ўсёй краіне дэпутат Вярхоўнага Совета СССР Нікіта Ермалаевіч Батоўкін. На яго грудзяхззяе ордэн Леніна. Тысячагоддзе аддзяляе радзімічаў ад сучаснасці, Ірвідуба ад Батоўкіна. Гэта тысячагоддзе і ёсць велічная гісторыя магутнага беларускага народа, якая не знайшла яшчэ адпаведнага ёй адлюстравання ў мастацкай літаратуры.

Аб далёкім гераічным мінулым нашага народа сведчыць глыбока патрыятычнае «Слова аб палку Ігаравым». Акрамя хвалюючых радкоў, прысвечаных Усеславу «чарадзею» і бітве на Нямізе, невядомы геніяльны пісьменнік з болем адзначае:

«Ужо Сула не цячэ пералівамі срэбнымі да горада Пераяслаўля і Дзвіна цячэ да тых грозных палачанаў мутная ад крыку паганых. Адзін толькі Ізяслаў Васількаў сын пазваніў сваймі вострымі мечамі аб шаломы літоўскія, перабіў славу дзеду свайму Ўсеславу, а сам пад чырвонымі шчытамі на крывавай траве перабіт літоўскімі мечамі... Дружыну тваю княжа, птушкі крыллем закрылі, а кроў яе звяры палізалі».

Прыблізна ў гэты час на Дзвіне, пра якую пазней Іван Грозны сказаў: «у яе дно залатое, а берагі сярэбраныя», з'яўляюцца такзваныя Барысавы камні з надпісамі:

«Госпадзі, памазі рабу свайму Барысу».

На працягу стагоддзяў сведчылі яны сваімі літарамі, што свабодалюбівая краіна, якую спрабавалі лічыць сваёй літоўскія князі, польскія каралі,—адвеку руская. На Беларусі нават «нямое каменне» крычала:

Здесь русский дух,
Здесь Русью пахнет.

Заслугоўвае ўвагі мастака паданне аб існуючай і сёння Тур-студні ў шматвяковым Тураве—дрэгавіцкім «Кіцеж-градзе». У гарадах і вёсках сляпыя лірнікі — барды беларускага народа—пяялі пра гэту студню, якую татары пры сваім нашэсці закідалі груднымі дзецьмі і на працягу сямі год з яе біла крыніцай мацярынскае малако. Толькі страшны ў сваім гневе і вялікі ў сваёй любві неўміручы народ мог стварыць такія гістарычныя паданні-жамчужыны, начыненыя порахам нянавісці.

Нельга прайсці роўнадушна міма бітвы пад Грунвальдам у 1410 годзе, дзе дрогнулі каралеўскія крылатыя гусары і канчатковае паражэнне «крыжаносшаму зброду» (Карл Маркс) нанеслі беларускія палкі альбо «лапцюжнікі», як іх з пагардай называла шляхта.

На Беларусі ёсць месцы, што атрымалі сваю назву ад крыві. У Гарадокскім раёне, каля калгаса імя камандарма Катоўскага, працякае ручай Красінец. У часе Лівонскай вайны па ім бегла кроў найхрабрых стральцоў Івана Грознага. Па сёнешні дзень мост праз Палату ў Полацку, па вуліцы імя Фрунзе, называецца Красным ад крыві рускіх ратнікаў. Пецербургскія і наўгародскія прыгоннікі, яны разбілі тут у 1812 годзе загартаваных у баях з усёй Еўропай грэнадзёраў маршала Сен-Сіра. Беззаветныя патрыёты сваёй радзімы, яны, як піша ў сваім пісьме ранены ў гэтай бітве рускі пісьменнік Загоскін, увайшлі ў горад са старой салдацкай песняй:

Ты, Расея, ты, Расея,
Мать расейская земля!
Про тебя ли, мать Расея,
Далеко слава прошла.

Не знайшлі яшчэ адлюстравання ў нашай літаратуры: Севарын Налівайка (1595) і Мацюшка Гультай (1590), звязаныя з Магілеўшчынай; загоны Антона Небабы (1648) з Папрышяцця; атаман Паддубіч (1649), які разам са сваім атрадам спаліў сябе ў Бабруйску ў царкве, але не здаўся; гераічны паход Ільі Галоты; Максім Жалезняк (1770) і яго беларускія гайдамакі; атаман Іван Залатарэнка (1654), забіты ў Старым Быхаве арганістам; славутыя атаманы: Крывашапка, Гаркуша, Галавацкі, Напаліч, Міхаленка, Хвэська. І, як зварот гэтых самаадданых герояў да сучаснасці, гучаць словы вялікага сына братняга украінскага народа Багдана Хмяльніцкага:

«Браты, рыцары, малайцы, няхай будзе вам вядома, што мы ўзяліся за свае верныя казацкія шаблі не дзеля славы альбо здабычы, а дзеля абароны радзімы, жонак і дзяцей нашых. Усе-ж народы абараняюць сваё жыццё і свабоду».

Амаль не адлюстраваны народныя паўстанні: у 1600—1610 г. г. у Магілеве, якое ўзначальваў мешчанін Стахор Мітковіч; у 1623 годзе ў Віцебску, калі быў забіт уніяцкі архіепіскап Іосафат Кунцэвіч. У прысудзе суда, на які аказваў ціск папа Урбан VIII, адзначаецца, што за гэта паўстанне трэба адсячы галовы ўсім віцеблянам. Нічога няма аб народным паўстанні 1740—43 г. г. у Крычаве і аб яго героях Карначу і Вашчыле: аб забойстве народам у Антаполі, Кобрынскага павета, іезуіта Баболі. Аб варожасці чорнага каталіцкага груганя сведчыць тое, што калі ў 1928 годзе ў Оршы пераабсталёўвалі пад клуб былы трынітарскі касцёл, дык знайшлі ў падвалах будынка ўзброеных трынітараў. Касцякі манахаў ляжалі ў трунах з крыжамі на грудзях, з шаблямі ў руках.

І тут трэба да апошняй кроплі данесці тую вялікую і свяшчэнную нянавісць, якую адчуваў і адчувае народ да сваіх адвечных заклятых ворагаў. Толькі горды і свабодалюбівы народ-барацьбіт мог стварыць такія яркія гістарычныя прыказкі, насычаныя да краёў бязмежнай пагардай, як:

«Батура — сабачая натура».
«Здохла сучка ў дзядзькі Сімона, дык няхай жыве каралева Бона».

На тэрыторыі Беларусі прайшла, пакінуўшы тысячы курганаў, Вялікая Паўночная вайна. Пад Лясной, за 12 кілометраў ад Прапойска, быў разбіт Левенгаупт. У Бешанковічах захаваўся стары дом, дзе Пётр І атрымаў «донос на гетмана злодея» (Пушкін). Цікава, што Магілеўская шоўкавая фабрыка пабудавана ў мясцовасці, якая называлася Карлавай далінай, а Крычаўскі цэментавы завод — на Пятровым лузе.

Айчынная вайна 1812 года закранула без малога ўсю Беларусь. Пад Віцебскам адбыўся трохдзённы ар'ергардны бой, аб характары якога сведчыць загад генерала Остэрмана-Талстога:

«Стаяць і паміраць!».

Пад Сівошыным Перавозам, Полацкага раёна, загінуў смерцю храбрых любімец салдатаў, віцеблянін па паходжанню, генерал Кульнёў. Гэта яму шведскі паэт Руненберг прысвяціў поўныя захаплення «Апавяданні Фенрыка Столя», і гэта аб ім успамінае Жукоўскі ў сваім патрыятычным творы «Певец во стане русских воинов». Крывёю сэрца трэба пісаць пра Магілеўскую губернскую інвалідную каманду, якая складалася з 30 былых сувораўскіх «дзіва-багатыроў». Пры суадносінах 1 да 2.400 гэта неўміручая каманда паспрабавала затрымаць корпус маршала Даву. І нарэшце, за 15 кілометраў ад Барысава, на Бярэзіне, знаходзіцца калгас «Чырвоная Студзёнка» (былая вёска Студзёнка). У яе такая-ж сусветная вядомасць, як у Ватэрлоо, Аўстэрліца, Ваграма. З ёю звязаны, такзваныя «траншэі генерала Эбле», зробленыя па загаду Напалеона сярод трупаў яго-ж салдатаў.

Не можа не хваляваць паўстанне 1863 года супроць царызма і вобраз рэволюцыянера-дэмакрата Кастуся Каліноўскага. На думку вульгарызатараў, паслядоўнік ідэй Герцэна і Чэрнышэўскага — Каліноўскі з'яўляўся толькі «дробным феадалам». Нацыяналісты ў сваіх гнусных мэтах старанна фальсіфіцыравалі гэты гераічны вобраз, але няма нічога супольнага ў арла з кажанамі-крывасмокамі.

Яшчэ не напісана гісторыя нашых старых фабрык і заводаў, дзе загартоўваўся ў класавых бітвах рабочы клас Беларусі. Асабліва цікавы гісторыі Добрушскай папяровай і Віцебскай ільнопрадзільнай імя Л. М. Кагановіча (б. «Дзвіна») фабрык. Не менш цікавы гісторыі прыгонніцкіх фабрык, заснаваных у канцы XVIII стагоддзя літоўскім падскарбіем Антонам Тызенгаузенам на Гродзеншчыне, літоўскім канцлерам Сапегай у Ружанах, Слонімскага павета, Радзівіламі ў Несвіжы і Слуцку.

Будучыя «іскраўцы» прымалі самы актыўны ўдзел у першых святкаваннях Першага мая: у Мінску ў 1895 годзе, у Віцебску ў 1899 годзе. Ў рэволюцыйнай барацьбе нарадзіліся славутыя большэвіцкія камітэты: Паўночна-Заходні, Палескі, Мінская група РСДРП. І вельмі характэрна тое, што іменна ў Мінску — сучаснай сталіцы БССР, а тады губернскім горадзе — адбыўся ў 1898 годзе Першы з'езд РСДРП. Цяжка знайсці больш удалую тэму, чым гэта.

Рэволюцыя 1905 года ўскалыхнула ўсю краіну, як ніколі раней. У Магілеве, Брэсце, Горы-Горках паліцыя збівала дэманстрантаў, у Мінску, Віцебску, Пінску, Мазыры, Полацку расстрэльвала іх, але царызм атрымаў у той незабыўны год цяжкую рану. І адзіны рабочы рэволюцыйны фронт цягнуўся тады ад славутых барыкад маскоўскай Краснай Прэсні да мястэчка Крынкі на Гродзеншчыне, дзе 1.500 гарбароў захапілі ў свае рукі ўладу і тры дні змагаліся за яе.

Вялікі Кастрычнік і стварэнне беларускай дзяржаўнасці яшчэ недастаткова закрануты ў нашай літаратуры. Трэба ў велічных высока-мастацкіх вобразах паказаць тую бязмежную падзяку, якую адчувае беларускі народ за клопаты аб сваім лёсе да Владзіміра Ільіча Леніна, Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, да іх бліжэйшых саратнікаў — Я. М. Свердлава, М. В. Фрунзе, Л. М. Кагановіча, Г. К. Орджанікідзе, К. Е. Варашылава, А. Н. Мяснікова.

Як невычарпальны акіян, так невычарпальны тэмы, звязаныя з грамадзянскай вайной, з партызанскім рухам. Тут на працягу некалькіх год канцэнтрыруецца велізарная колькасць падзей тытанічнага маштабу. Баллады альбо паэмы заслугоўвае легендарны бранявік «Здань Валадарскага». Цікава, што ён змагаўся пад Магілевам з белапалякамі якраз на тым месцы, дзе сто год раней змагаліся з французскімі захопнікамі сувораўскія «дзіва-багатыры». Мы, нажаль, амаль нічога не знойдзем у мастацкай літаратуры пра партызанаў—дукорскіх, рудабельскіх, чачэрскіх, каменскіх, расасенскіх, лепельскіх, і наўрад ці ведае хто, што ў часе расстрэлу адзін смяротна ранены лепельскі партызан прыўзняўся на локцях і плюнуў у твар афіцэру-акупанту. І характэрна, што гэтаму самаму афіцэру перад тым пацалаваў руку мясцовы фабрыкант Валаткевіч.

Пры ўспаміне аб далёкім мінулым радзімы адразу ўспамінаюцца хвалюючыя радкі з «Слова аб палку Ігаравым»:

Што гэта шуміць, што гэта звініць
далёка ўранні перад зарою?

Свяшчэнны абавязак совецкага пісьменніка — пачуўшы ў гістарычных далях гэты шум народных паўстанняў, данесці яго да соцыялістычнай сучаснасці.

Пры ўспаміне аб блізкім мінулым радзімы адразу ўспамінаецца хвалюючы надпіс, выцараланы цвіком на сцяне турэмнай камеры нязломным большэвіком Нікалаем Білецкім:

«Перадайце таварышам прывітанне і скажыце ім, што гомельскія комунары з чэсцю загінулі на сваім пасту».

Гэты зварот адрасаван у першую чаргу да пісьменнікаў. Перад імі—надзвычайныя героі, сітуацыі, сюжэты. Яны чакаюць свайго ўвасаблення ў праўдзівых і манументальных вобразах. І выхаванне нацыянальнай гордасці, выхаванне совецкага патрыятызму на гераічных прыкладах народнай гісторыі — пачэсная і благародная задача совецкіх пісьменнікаў.

Віцебск.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

На справаздачна-выбарчым сходзе

Справаздачна-выбарчы сход у партарганізацыі Дзяржаўнай філармоніі БССР пачаўся са спазненнем на поўгадзіны. Нам. сакратара арганізацыі тав. Гібхін у першы дзень зусім не прысутнічаў на сходзе, тлумачачы гэта тым, што ён... не ведаў аб ім. Сакратар партарганізацыі тав. Любан не напісаў даклада і рабіў справаздачу па тэзісах, у якіх з прычыны спешкі былі выпушчаны вельмі істотныя моманты аб рабоце арганізацыі.

Усе гэтыя непаладкі, як высветлілася са спрэчак па дакладу, з'яўляюцца вынікам значных недахопаў у рабоце камуністаў філармоніі.

Сакратар партарганізацыі не знайшоў яшчэ часу для абмеркавання на партсходзе гістарычных пастаноў XVIII канферэнцыі ВКП(б). Не было ў арганізацыі кантролю над таварышамі, якія індывідуальна вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і тав. Любан не мог сказаць, хто які раздзел курса зараз вывучае.

Партарганізацыя на сваіх сходах не абмяркоўвала творчых пытанняў, ды і наогул партсходы скліканіся даволі рэдка і бессістэмна. У арганізацыі не было нават плана работы.

Не наладжана ў арганізацыі і партыйная гаспадарка.

Названыя недахопы ў рабоце партарганізацыі філармоніі былі падвергнуты суровай крытыцы ў выступленнях камуністаў т. т. Цёмкіна, Прагіна, Арыярскага і інш.

У дакладзе і спрэчках былі адзначаны вялікія дасягненні, якіх дабілася філармонія ў мінулым годзе. Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве паказала, што калектывы філармоніі творча выраслі. Выдатныя дасягненні філармоніі і яе работнікаў былі адзначаны ўзнагародамі. Філармонія стала ордэнаноснай. Ордэнамі Савецкага Саюза былі ўзнагароджаны поруч з іншымі таварышамі і камуністы т. т. Любан і Прагін. Калектывы філармоніі пасля дэкады яшчэ больш плённа працуюць над узняццем якасці сваёй работы, над папаўненнем рэпертуару новымі творамі беларускіх кампазітараў. З поспехам выконвае сімфанічны аркестр 9-ю сімфонію Бетховена, 5-ю і 6-ю сімфоніі Шастаковіча.

У спрэчках па дакладу было справядліва ўказана на неабходнасць узмацнення творчых сувязей філармоніі з беларускімі кампазітарамі. Філармонія правяла ў гэтым годзе ў БССР гастролі артыстаў і мастацкіх калектываў братніх рэспублік. З асаблівым поспехам прайшлі гастролі вядомага піяніста Эміля Гілельса, лаўрэатаў Сталінскай прэміі Тамары Ханум і Н. Шпілер, ансамбля песні і пляскі цыганоў пад кіраўніцтвам кампазітара Дунаеўскага.

Выступаўшыя ў спрэчках т. т. Арыярскі, Прагін, Шапіра і інш. гаварылі аб сур'ёзных недахопах у рабоце мастацкага кіраўніцтва філармоніі, аб недастатковай барацьбе дырэкцыі за выкананне гаспадарча-фінансавага плана 1941 года.

Сход прызнаў работу партарганізацыі за справаздачны перыяд здавальняючай.

У прынятай па справаздачнаму дакладу рэзалюцыі сход намеціў мерапрыемствы па ажыццяўленню пастаноў XVIII канферэнцыі ВКП(б), па ўдзелу калектываў філармоніі ў выкананні гістарычнай пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб асушцы балотаў у БССР.

Сакратаром партарганізацыі Дзяржаўнай філармоніі БССР зноў выбран тав. І. Любан.

М. МОДЭЛЬ.

Абмеркаванне лібрэта оперы „Кастусь Каліноўскі"

На сходзе партыйнай арганізацыі Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР было прачытана і абмеркавана новае опернае лібрэта М. Клімковіча «Кастусь Каліноўскі». Выступіўшыя ў спрэчках т. т. Глебка, Вольскі, Броўка, Гурскі, Куляшоў, Модэль адзначылі, што лібрэта Клімковіча дае ўдзячны матэрыял для стварэння цікавай оперы на гістарычную тэму. Адначасова выступаўшыя ўказалі на рад недахопаў лібрэта — невыразнасць вобраза Ольгі, моўныя недахопы ў асобных месцах. Каб пазбавіцца гэтага, аўтару патрэбна яшчэ працаваць у цесным кантакце з кампазітарам і Тэатрам оперы і балета.

Нажаль, Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР і Тэатр оперы і балета паставіліся да лібрэта аб Каліноўскім некалькі абыякава. Прычына гэтага крыецца нібы-та ў тым, што паміж гісторыкамі ідуць спрэчкі аб палітычных поглядах і арыентацыі Каліноўскага, і пакуль не вырашана гэта пытанне, ні Упраўленне па справах мастацтваў, ні тэатр нічога не робяць, каб дапамагчы аўтару ў яго складанай рабоце па стварэнню оперы аб арганізатару і правадыру сялянскага паўстання 1863 года ў Беларусі.

Выступаўшыя на сходзе таварышы зусім слушна заўважылі, што спрэчкі паміж гісторыкамі аб некаторых прыватных пытаннях у дзейнасці Каліноўскага ніякага дачынення да работы тав. Клімковіча не маюць, таму што вобраз Каліноўскага ў лібрэта паказан правільна, як вобраз беларускага нацыянальнага героя. Так Каліноўскі трактуецца і ў нарысах па гісторыі СССР пад рэдакцыяй Шэстакова, і ў «Истории СССР» пад рэдакцыяй праф. Панкратавай. У апошнім падручніку аб гэтым напісана наступнае:

«Арганізатарам і правадыром сялянскага паўстання ў Беларусі быў Кастусь Каліноўскі. Са сваімі адозвамі на беларускай мове ён звяртаўся непасрэдна да беларускага селяніна, абяздоленага і забітага памешчыкамі і царскімі ўладамі. Каліноўскі патрабаваў дэмакратычнага ўладкавання вольнай Беларусі і правядзення аграрнай рэформы на карысць сялян. Заслугай Каліноўскага з'яўляецца таксама і тое, што ён усімі спосабамі прапагандыраваў беларускую мову. Ён адстайваў палітычнае роўнапраўства сялян-беларусаў» (частка 2-я, стар. 201).

Як бачым, «баязнь» у гэтым пытанні работнікаў Упраўлення па справах мастацтваў і Тэатра оперы і балета не мае пад сабой ніякага грунту. Патрэбна больш смела і актыўна ўзяцца за работу і дапамагчы аўтару лібрэта і кампазітару стварыць оперу аб Каліноўскім. Лібрэта оперы «Кастусь Каліноўскі», напісанае М. Клімковічам, уяўляе вялікую цікавасць.

„Дон Кіхот"

Прэм'ера Дзяржаўнага ордэна Леніна тэатра оперы і балета БССР

Каму не вядома старамодная, дзівакаватая фігура «рыцара сумнага вобраза» Дон Кіхота з яго верным таўсцяком-зброеносцам Санчо Панса? Мігуэль Сервантэс дэ-Сааведра ў дасканалай форме прадставіў іх апісанне ў сваёй славутай кнізе «Дон Кіхот Ламанчскі». На працягу стагоддзяў існавання гэтага рамана (ён выдан у 1605 годзе) узнікалі спробы даць сцэнічнае ўвасабленне вобразу яго галоўнага героя, які жыве ў фантастычных летуценнях аб чароўнай даме, абранніцы яго сэрца, аб злачынцах, чараўніках, таямнічых пачварах, аб нявінных афярах, што пакутуюць у калдоўскіх чарах.

Такую спробу ў 1869 годзе зрабіў Людвіг Мінкус—кампазітар, які прыехаў у Расію з Вены і заняў пасаду спецыяльнага кампазітара імператарскіх маскоўскіх тэатраў. Ён напісаў балет «Дон Кіхот», музыка якога дайшла да нашага часу, хоць яна і не з'яўляецца, аднак, ідэйна-насычанай і сатырычна-вострай, як самы твор Мігуэля Сервантэса.

Такім чынам агульнага паміж раманам Сервантэса і балетам Мінкуса нічога няма, за выключэннем хіба назвы ды ўмоўнай фігуры Дон Кіхота, якую глядач дапаўняе фарбамі знаёмага яму літаратурнага твора. Фігуры вандруючага рыцара і яго хітраватага зброеносца прадстаўлены ў балеце нібы прыкладзенымі да самастойнай яго інтрыгі. Іх казачныя прыгоды разгортваюцца на фоне традыцыйнай барацьбы старыкоў з іх мараллю аб шлюбе па выгодзе і маладых з іх усёперамагаючым імкненнем да свабоднага выбару каханай.

Кітэрыя, дачка небагатага тракціршчыка, усёй сілай сваёй маладосці кахае барселонскага цырульніка Басіліо. Але ўсё багацце Басіліо заключаецца ў яго палымнеючых, поўных затоенай страсці вачах, у яго моцным здароўі ды вынаходлівай галаве, здольнай на самыя рызыкоўныя выдумкі. За Кітэрыю сватаецца багаты жаніх — Камачо, чыя смешная, падагрычная фігура з'яўляецца прадметам кпінаў прыяцеляў Басіліо і Кітэрыі. Прываблены багаццем бацькі прымушаюць Кітэрыю на шлюб з нялюбым. Але вынаходлівым каханкам удаецца ашукаць бацькоў. Падаспеўшы ўчас Дон Кіхот угаворвае бацькоў Кітэрыі згадзіцца на яе шлюб з Басіліо.

Гэткая нескладаная драматургічная канва спектакля. Задача пастаноўшчыка, такім чынам, зводзілася да таго, каб максімальна выпукла падаўшы вобраз Дон Кіхота, разгарнуць побач з гэтым тэму Кітэрыі і Басіліо. Не гледзячы на замкнутыя творчыя рамкі, паводле музычнай фактуры балета, пастаноўшчыку яго К. Мулеру ўдалося стварыць яркі, запамінаючыйся спектакль, поўны дынамікі, абаяльнасці і балетмейстарскай фантастыкі.

Калі мы спрабуем параўнаць балетмейстарскія і рэжысёрскія якасці спектакля, дык найбольш высокай ацэнкі заслугоўваюць першыя, хоць і ў другіх ёсць рад удалых палажэнняў. Асноўны мінус пастаноўкі падае на яе сюжэтную лінію, якая часта разрываецца, саступаючы месца другараднаму, не асноўнаму сцэнічнаму дзеянню. Карціна млына, напрыклад, узята як ілюстрацыя прыгод Дон Кіхота паводле рамана, не маючы, аднак, адносін да прамой лініі інтрыгі самога спектакля. Вобраз Дон Кіхота прадстаўлен больш у гумарыстычным, чым у сатырычным плане. У адносінах дзеючай масы да яго ўлоўліваецца хутчэй спагадлівая сімпатыя, чым іронія і кпіны з няўдачлівага героя нашумеўшых рыцарскіх подвігаў. У масавых сцэнах на плошчы, у таверне дзейнічае ў асноўным маса тыпова «балетная», характэрная для любога класічнага поўдывертысментнага спектакля, тады як хацелася-б бачыць у іх большую колькасць народных тыпажаў. Пры наяўнасці асобных добра задуманых і чотка пададзеных мізансцэн, некаторыя ўсё-ж недастаткова раскрыты, з прычыны чаго робяць уражанне надуманых альбо мала апраўданых.

Найбольшай выразнасці ў спектаклі дасягаюць сцэны на плошчы і фінал у таверне, дзе прастата і яснасць ігравога замыслу відавочны. Аднак пэрл спектакля закладзен у яго танцы. Мора сцэнічнага тэмпераменту, экспрэсіі і разумнай грацыёзнасці ўкладзена ў кожны з іх. На выдатным рысунку, з прыгожым спалучэннем ліній і фігур зроблены сегедзілья, фанданго, эльвіто, танец торэадораў. Абстановачна апраўданымі танцамі багата сцэна ў таверне.

Сцэна з балета «Дон Кіхот». Злева направа: Санчо Панса — артыст П. Радзевіч, Дон Кіхот — артыст Н. Гульман, Кітэрыя — засл. артыстка БССР А. Нікалаева, Басіліо — саліст балета С. Дрэчын.

Фота І. Каплінскага.

Гарманічная беднасць музыкі Мінкуса не можа задаволіць рэжысёрскіх і балетмейстарскіх патрабаванняў. Гэта, відаць, падштурхнула пастаноўшчыка на ўключэнне ў балет раду ўстаўных нумароў. Пры пэўнай эфектыўнасці гэтага дадатку, нельга ўсё-ж сказаць, што ён ва ўсіх сваіх частках ідзе на карысць спектакля. Залішняе, нават калі яно добрае (а кожны ўзяты ў паасобку нумар безумоўна добры па якасці) заўсёды з'яўляецца ці стамляючым, ці хваравітым. Спробу пастаноўшчыка наблізіцца да рэалістычнай падачы фабулы спектакля мы лічым зусім правільнай, у процівагу сцвярджэнню, што балет тыпу «Дон Кіхота» павінен быць чыста забаўляльным, а значыць абстрактным, не накіраваным спектаклем.

Спектакль набывае асаблівую маляўнічасць дзякуючы афармленню мастака Б. Матруніна. Выразныя, свежыя дэкарацыі, удала вырашаныя перспектыўна, апрача таго і добра выкананы. Другая і апошнія карціны даюць рэльефны і глыбокі марскі пейзаж з відам адной з плошчаў Барселоны. У афармленні трэцяй карціны знойдзены мяккія тоны фарбаў, якія выдатна спалучаюцца з сілуэтамі паступова аддаляючыхся ветракоў. У карціны лясных дрыяд укладзена шмат ружовай, крыху наіўнай, як і самыя летуценні Дон Кіхота, фантазіі. Дэкарацыя лесу выканана слабей. Не маючы глыбіні, яна здаецца крыху назойлнай і не дае воку свабоды ўспрыняцця.

Ордэнаносны калектыў тэатра мае гібкі і моцны аркестр. Але дырыжор Н. Балазоўскі не дабыў з яго ўсёй паўнаты гучання, апрача асобных месцаў, якія з гэтага пункту гледжання ўдаліся. Выхад торэадораў — найбольш моцнае месца ў спектаклі, але ў аркестровым выкананні ён гучыць непераканаўча, без адпаведнай экспрэсіі, і таму праходзіць недастаткова ўздымна. Не заўсёды адчуваецца кантакт паміж дырыжорскай палачкай і выканаўцамі на сцэне. Тэмпаванне асобных нумараў не зусім увязваецца са ступенню патрэбнай неабходнасці гэтага. У даным сэнсе найбольш роўна, з пачуццём меры і спецыфікі танца, праходзяць па-дэ-дэ, адажыё ў лесе, варыяцыі сяброў, танец Мерседэс і некаторыя іншыя.

Можна парадавацца амаль поўнай адсутнасці пасіўнасці дзеючай масы пры рэагіраванні на ўсе сцэнічныя падзеі. Захапляючымі воплескамі сустракае яна сваіх лепшых танцораў — Кітэрыю і Басіліо, запаляючы іх на агністыя, поўныя ўнутранага гарэння танцы.

Выканальніца партыі Кітэрыі заслужаная артыстка БССР А. Нікалаева разам з салістам С. Дрэчыным, выканаўцам партыі Басіліо, прачутта праводзяць свае цэнтральныя партыі. Але ёсць і асобныя недахопы ў вядзенні іх партый. У артысткі Нікалаевай іншы раз заўважаецца некаторая наігранасць, штучнасць, што аслабляе ствараемы ёю вобраз. Артыст Дрэчын, валодаючы багацейшым запасам творчай энергіі, акторскую тэхніку асвоіў усё-ж недастаткова, з прычыны чаго часта бессістэмна распырсквае згусціўшыяся ў ім сцэнічныя эмоцыі, што не заўсёды накіроўвае ўвагу гледача на патрэбны аб'ект, а, наадварот, рассейвае яе. У абодвух выканаўцаў найбольш удала выглядаюць характэрныя і дэмі-характэрныя нумары. Яны падаюцца імі ў закончанай форме, пакідаючы моцнае ўражанне ў гледача. Слабей праходзіць уся класічная частка, дзе хочацца пажадаць выканаўцам адыходу ад іх некалькі прэтэнцыёзнай манеры танца, як і дапрацоўкі многіх рухаў (менш па тэхніцы, але больш па прыродзе класічнай структуры іх).

Вобраз Дон Кіхота, створаны артыстам Н. Гульманам, зразумелы і не пазбаўлены тыповых для яго асаблівасцей. Выканаўцу ўдалося пазбегнуць магчымага тут пераігрывання, з-за чаго ўся ігра яго набывае асаблівую станоўчасць. Ролю Санчо Панса ў выкананні артыста Л. Радзевіча можна лічыць зусім удалай. Ігра выканаўца прачутая і шчырая. На працягу ўсяго спектакля ён роўна вядзе сваю партыю, знаходзячы ў ёй тонкія гумарыстычныя штрыхі, не адыходзячы ад яе і не выключаючыся. Артыст О. Хазан пераканаўча праводзіць ролю жаніха Камачо, хоць яму можна ў большай ступені выкарыстаць музычную акцэнтоўку для надання ролі новых камічных дэталей.

Менш за ўсё ўдаўся ў спектаклі вобраз тракціршчыка Ларэнца (выканавец Ф. Пінно). Выражэннем паўнейшай незацікаўленасці і абыякавасці пранізана ўся яго фігура.

Выключны поспех выпаў на долю артысткі А. Багданавай, якая выконвае танец Мерседэс, і артысткі Т. Узунавай, якая выканала хабанеро (музыка Сарасатэ) з чатырма кавалерамі. Іх выкананне танцаў стаіць на вялікай вышыні, з'яўляючыся самым яркім месцам усяго спектакля.

Варыяцыі сяброў Басіліо, выкананыя артыстамі А. Вітольбергам і Д. Самохіным, сведчаць аб іх сцэнічнай спеласці.

Красачныя і разнастайныя касцюмы робяць гонар мастаку, які даў расфарбоўку іх, і майстэрні, якая іх выканала.

Пастаноўка «Дон Кіхота»—этап у паслядоўным асваенні тэатрам вышэйшага харэаграфічнага майстэрства. На аснове крытычнага выкарыстання спадчыны мінулага калектыў ордэнаноснага тэатра набліжаецца да стварэння сапраўды нацыянальнага беларускага балетнага мастацтва. Якасць паказанага спектакля настолькі відавочна, што можна смела сцвярджаць аб яго не толькі рэспубліканскім значэнні. «Дон Кіхот» надзвычай жаданы для беларускага гледача спектакль.

Н. СМІРНОЎ.

Брэсцкі абласны рускі тэатр

Калектыў нашага тэатра з вялікай радасцю прыняў паведамленне аб тым, што мы накіроўваемся працаваць у заходнія області Савецкай Беларусі.

Годы, праведзеныя ў сценах Дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва ў Маскве, далі ўсім нам вельмі многа. Тэатры Масквы спрыялі нашаму творчаму росту; на працягу чатырох год мы выхоўваліся пад кіраўніцтвам буйнейшых майстроў савецкага тэатра; краіна дала нам магчымасць вучыцца, прадаставіла ўсё для росту кожнага з нас у паасобку і ўсяго калектыва ў цэлым. І ясна, што ўсім нам хацелася як найхутчэй убачыць плады сваёй работы, на практыцы праверыць усё тое, што было знойдзена ў школе, адказаць работай на тыя клопаты і ўвагу, якія аказваліся нам.

З жніўня па снежань 1940 года калектыў тэатра пасля сканчэння Тэатральнага інстытута знаходзіўся ў Маскве. У рабоце тэатра прымалі ўдзел тыя-ж педагогі, якія на працягу ўсіх год выхоўвалі яго калектыў. Вучэбныя работы пачалі знаходзіць сваё ўвасабленне ўжо ў вытворчым плане. Спектакль «Мяшчане», які мы пачалі рыхтаваць з другога года вучобы, быў неаднаразова паказан маскоўскаму гледачу. Другі спектакль—«Любоў Яравая» — быў у перыядзе выпуску. Для спектакля «Небяспечны паварот» нехапала толькі афармлення, у астатнім ён быў ужо гатовы. Усёй гэтай работай кіравалі рэжысёры, педагогі і выхавальнікі калектыва — заслужаны артыст РСФСР В. Белакураў, В. Марцьянава, А. Окунчыкаў.

Прыехаўшы ў Брэст, мы пераканаліся ў тым, што для тэатра шмат ужо зроблена. Перш за ўсё мы атрымалі сапраўдны тэатральны будынак. Грамадскія і партыйныя арганізацыі сустрэлі тэатр вельмі добра. Атмасфера ўважлівасці і клопатаў давала нам стымул для работы. Мы адразу адчулі сябе як у родным горадзе.

Брэст у тэатральных адносінах зусім не асвоен. Да нас іспавалі тут асобныя трупы, гастралёры. Але яны давалі ў горадзе некалькі спектакляў і выязджалі. Наш тэатр з'явіўся першай стацыянарнай трупай. Перад нашым калектывам устала сур'ёзная задача—заваяваць гледача. І трэба сказаць, што з гэтай задачай мы справіліся. Горад адразу палюбіў наш тэатр, і мы не маем недахопу ў гледачах. За час прабывання ў Брэсце мы паказалі 57 спектакляў, абслужылі каля 27.000 гледачоў. Апрача работы на асноўнай пляцоўцы, тэатр двойчы выязджаў у Кобрын, Пружаны, Гайнаўку, Картуз-Бярозу. Выезды ў вобласць з'яўляліся для калектыва праверкай яго ўмення працаваць у розных умовах.

Работа ў новых вытворчых умовах, калі прыходзіцца выпускаць п'есы ў больш кароткі, чым звычайна, тэрмін, з'явілася праверкай таго, ці можам мы выпусціць спектакль не за паўтара года, а за 1—2 месяцы. Над «Мяшчанамі» мы працавалі два годы, над п'есай Любоў Яравая» — паўтара, над спектаклем «Небяспечны паварот» — год. Работа над «Славай» паказала, што спектакль мы можам выпусціць і за месячны рэпетыцыйны тэрмін. Задача — выпускаць спектаклі, якія па якасці не былі-б ніжэй за нашы маскоўскія пастаноўкі.

«Слава» мае поспех, спектакль хвалюе гледача, але ў ім яшчэ шмат сырых месц і мы яго зараз дапрацоўваем.

24 красавіка тэатр выпусціў спектакль «Самадуры» Гальдоні. Калектыў дэманстрыруе ім сваё ўменне працаваць над класічнай камедыяй. Пастаноўку ажыццявілі рэжысёр О. Старосціна, мастак А. Мішурына, кампазітар Г. Яблонь.

Адначасова рэпетыруецца п'еса «Мсціслаў Удалой» Прута. Гэты спектакль мы выпусцім у сярэдзіне мая. Выбар п'есы падказан жаданнем паказаць патрыятычны спектакль. На матэрыяле грамадзянскай вайны ў ім паказаны непрыкметныя героі, якія рабілі рэвалюцыю. Гэта спектакль аб мужнасці і непераможнасці нашага народа, аб нянавісці да ворага і аб любві да радзімы, за якую чырвонаармейцы каманды бронепоезда аддаюць жыццё.

Гэткія вынікі работы нашага тэатра. Неабходна сказаць яшчэ, што адным з цікавых бакоў нашай работы была сувязь з Масквой. Калектыў не парываў сувязі з выхаваўшымі яго педагогамі. Часты прыезд масквічоў і іх канкрэтная дапамога тэатру дапамагае будаваць тэатр. М. М. Тарханаў, наш мастацкі кіраўнік і настаўнік, шмат часу і клопатаў аддае Брэсцкаму тэатру і накіроўвае яго работу.

Адзіная школа, у якой выхоўваўся наш калектыў, — вось чым моцны наш тэатр. За гэта трэба дзякаваць педагогаў і М. М. Тарханава, выдатнага педагога, майстра, які так многа даў калектыву.

У кожным спектаклі мы імкнёмся дабіцца ансамбля. Спектакль «Мяшчане» мы любім больш за ўсё, па ім раўняем усе свае пастаноўкі. Да адкрыцця новага сезона ў Брэсце ў верасні мы мяркуем паказаць яшчэ адну п'есу М. Горкага — «Варвары». Зараз тэатр гастраліруе ў Беластоку, адсюль паедзе ў Гродна.

Прыклад работы нашага калектыва паказвае, што выпуск цэлымі тэатральнымі калектывамі — жыццёздольная форма выхавання тэатральных кадраў.

Б. КУЛЬНЁЎ.
Галоўны рэжысёр Брэсцкага тэатра.

„Слава"

Брэсцкі абласны рускі драматычны тэатр

П'есу В. Гусева «Слава» можна ставіць па-рознаму, але ў межах пэўнага жанру—лірычнай драмы. І як-бы рэжысёр ні вытлумачваў яе ў бытавым альбо гераічным плане, усё-ж гэта будзе лірычная драма, а не іншага жанру твор. Пастаноўшчык Б. Кульнёў і рэжысёр О. Старосціна паставілі «Славу» у жанры лірычнай камедыі. Змешванне жанраў пайшло не за кошт паляпшэння якасці спектакля, а за кошт абяднення яго, таму што рэжысёры імкнуліся абмежаваць п'есу рамкамі сваёй эксплікацыі і глыбока не ўскрылі змест яе.

Паэт В. Гусеў, выбраўшы тэму аб славе савецкіх людзей і шляхах да яе, безумоўна, не меў на ўвазе паказаць толькі смешнае, а імкнуўся ва ўсёй шырыні паказаць разнастайнае жыццё сацыялістычнага грамадства. Пры трактоўцы «Славы» як лірычнай камедыі шырыня далягляду звужаецца і на першы план высоўваюцца любоўныя ўзаемаадносіны Матылькова і Елены Мядзведзевай, а таксама ўсе бытавыя сцэны, якія так ці інакш звязаны з іх лёсам. Знешне, на першы погляд можа здацца, што выпуклена асноўнае—збліжэнне двух галоўных персанажаў. П'есу ў такой трактоўцы можна было-б назваць не «Славай», а — «Гісторыяй аднаго кахання». Тэма п'есы заключаецца ў тым, што слава прыходзіць да савецкіх людзей не выпадкова і не раптоўна, а заваёўваецца паслядоўна, шляхам доўгіх намаганняў, штодзённай гераічнай, добрасумленнай працай на карысць сацыялістычнай радзімы. Пачуццём патрыятызму пранізаны дзеянні ўсіх герояў «Славы». Быт і бытавыя ўзаемаадносіны з'яўляюцца толькі фонам, на якім адбываюцца гэтыя падзеі. Ён нібы паўней дарысоўвае шматбаковую дзейнасць сучаснага чалавека.

Сэнс драматычных сцэн, у якіх сустракаюцца Матылькоў, Очэрэт, Маяк і Елена Мядзведзева, зводзіцца да таго, што савецкія людзі цэняць жыццё кожнага члена свайго калектыва і гатовы ў любую хвіліну прыйсці яму на выручку, на дапамогу. Гэтыя сцэны поўны благароднага пачуцця клопатаў аб грамадзянах сваёй дзяржавы. І Матылькоў, які атрымлівае заданне ўзарваць насоўваючуюся лавіну, што пагражае абвалам электрастанцыі і жыццю жыхароў горнага пасёлка, не гнаўся за славай, а быў поўны жадання дапамагчы людзям выратавацца ад стыхіі прыроды. Драматург падкрэслівае, што на падобныя ўчынкі савецкія патрыёты ідуць з поўным усведамленнем важнасці справы. Тэма гераізму Матылькова прагучала ў спектаклі глуха. Затое і ў гэтых сцэнах пастаноўшчыкі шукаюць камедыйныя сітуацыі, ужываючы нават іронію, хоць мастацка гэтага ніяк апраўдаць тут нельга.

Сцэна з спектакля «Слава». Лена — артыстка М. Пастухова, Матылькоў — артыст Н. Волгушаў.

Фота В. Лупейкі (БЕЛТА).

У гэтых сцэнах замысел пастаноўшчыкаў уступае ў супярэчанне з замыслам драматурга. Паколькі драматычныя сцэны тлумачацца няправільна, то і развіццё дзеяння некалькі слабее. Зусім зразумела, чаму. Таму што драматычныя сцэны з'яўляюцца асноўнымі, яны знітоўваюць сюжэт у адзіны драматургічны твор, тады як камедыйныя сцэны ў большасці выпадкаў служаць для разрадкі альбо тлумачэння асноўных сюжэтных ліній.

Як-бы ні імкнуліся рэжысёры не аддаваць належнай увагі драматычным сцэнам, ім усё-ж прыходзіцца лічыцца з галоўнымі мыслямі твора і іншы раз адхіляцца ад сваёй камедыйнай трактоўкі яго. Але тады яны прымушаюць актораў не проста выражаць мыслі герояў, а дэкламіраваць з поваду пачуццяў, узаемаадносін, пэўных падзей. Такая трактоўка п'есы збівае актораў з правільнага рэалістычнага шляху раскрыцця вобраза і штурхае на шлях ложнай патэтыкі і абстрактнай рыторыкі.

Няяснасць рэжысёрскай мыслі можна заўважыць у самым пачатку спектакля (асабліва ў 1 акце). Возьмем для прыкладу некалькі мастацка непераканаўчых мізансцэн. Матылькоў выражае сваю радасць тым, што ўзлазіць на парэнчы агарожы парка; Очэрэт чамусьці ў момант хвалявання зусім неапраўдана сядае ў крэсла; калі Матылькоў і Маяк хвалююцца, дык абавязкова аднолькава, нібы згаварыўшыся, бегаюць па сцэне, што хутчэй нагадвае жах, чым нармальнае чалавечае хваляванне. Усё гэта вельмі сцэнічна, але не рэальна, надумана. У выражэнні ўзрушаных пачуццяў чалавека трэба дабівацца благароднай прастаты, а не прымітыўнай спрошчанасці. Савецкія людзі жывуць, працуюць, кахаюць адзін другога, робяць гераічныя ўчынкі, але ўсё гэта робяць скромна, без напышчаных фраз і жэстаў. Увасабляючы літаратурныя персанажы ў жывыя сцэнічныя вобразы, рэжысёры перш за ўсё павінны былі задумацца над спалучэннем жыццёвай і мастацкай праўды, таму што апошняя з'яўляецца творчым адлюстраваннем жыцця. Аднак, у спектаклі адчуваецца раз'яднанасць, няўпэўненасць ва ўласнай трактоўцы.

Недахопы рэжысёрскай работы асабліва сказаліся на стварэнні ролей. Акторы не здолелі ўвасобіць замысел пастаноўшчыкаў толькі таму, што ён, відавочна, не дайшоў да іх творчага ўсведамлення.

Нават у адносінах галоўных герояў — Васіля Матылькова (артыст Н. Волгушаў) і Елены Мядзведзевай (артыстка М. Пастухова), на якіх пастаноўшчыкі робяць увесь свой упор, цяжка знайсці адзіную мысль, якая-б яднала і творча радніла іх. Любоўныя пачуцці выражаюцца саладжава, сяброўскія адносіны наіўныя, сварка трафарэтная. У іх адносінах усё так звычайна, будзённа, што дзіву даешся, чаму яны з'яўляюцца галоўнымі героямі? Лена прыгожая, але ў ёй шмат пазёрства, тэатральнага найгрышу і няма вобраза лірычнай дзяўчыны нашага часу. Яна какетнічае, гуляе ў каханне. Васіль, — вобраз волевага чалавека, якому ўласцівы лепшыя рысы сучаснага чалавека: скромнасць, прастата, задушэўнасць, — ператворан у рэзанёра. Асноўныя якасці персанажа засталіся па-за ролю. Іншы раз ён знаходзіць цікавае вырашэнне (сцэна з Очэрэтам — першая сустрэча), думаеш, што ён знайшоў сутнасць вобраза, але ў наступных сцэнах гэта знаходка гіне.

Больш пакутны пошукі вобраза Очэрэта артыстам В. Калішэвым. Два разы мне давялося глядзець спектакль, і фактычна я ўбачыў дзве розныя ролі. Відаць, што актор працуе, упарта шукае вобраз, але пакуль праца яго не мае поспеху. Асабліва ў пачатку спектакля не адчуваецца клопату і трывогі аб людзях, якіх ён любіць як родных, блізкіх і дарагіх. Ён толькі гаворыць змястоўныя словы, але яшчэ не адчуў іх, не пераканаўся ў іх праўдападобнасці.

Зусім не ўдаўся выдатны вобраз Марыі Пятроўны Матыльковай. Артыстка Е. Неверава іграе гэту ролю няўпэўнена, азіраючыся.

Такі-ж няўдалы і Маяк (артыст Б. Каракін). Паспешнасць, нядбайнае вымаўленне тэксту, скарагаворка стварае сумбурнае ўражанне.

Гэта група асноўных персанажаў ахарактарызавана ў спектаклі бледна толькі таму, што акторы не раскрылі асноўных якасцей сваіх вобразаў, а рэжысёры прайшлі міма гэтага, а іншы раз не зусім удала прымушалі іх да камедыйных прыёмаў ігры, тады як у іх характарах, у большасці выпадкаў, больш драматычнага, чым камічнага. Акторы не валодаюць вершам. Усе дэкламіруюць, але не чытаюць яго.

Найбольш удалымі сцэнамі з'яўляюцца жанравыя. Яны і рэжысёрамі пастаўлены больш змястоўна. Два характэрных вобразы — заслужаны артыст рэспублікі Мядзведзеў (артыст В. Мураўёў) і прафесар хірург Чарных (артыст М. Штэйнберг) насычаны добрадушнай іроніяй, разумным гумарам, а ў некаторых эпізодах мудрай старыкоўскай дасціпнасцю. Але і ў гэтых вобразах ёсць недахопы. Дрэнна выканан Мядзведзевым старажытны раманс, ён мастацка не зроблен. Чарных у сцэне горнага лазарэта не распрацаваў маналога аб гераізме чалавека і сіле стыхіі. У ім няма глыбокадум'я, іронія засланяе філасофію старога прафесара, які па-свойму разумее жыццё.

Цікава створаны два камедыйныя персанажы — Нораш (артыстка В. Копшына) і Студзенцоў (артыст С. Галуза). Яны ў плане спектакля. Абаяльны гумар, лёгкая манера ігры, празрыстасць і яснасць гэтых фігур выклікаюць поўнае ўхваленне гледача.

Ролі піонера і піонеркі (артыст З. Даніловіч і артыстка І. Ткачова) выкананы вельмі ўдала. Гэтыя эпізадычныя персанажы па-дзіцячаму наіўныя, смешныя, знаходлівыя.

Не гледзячы на асобныя ўдачы, у спектаклі ўсё-ж няма поўнага ансамбля. Разнабой у трактоўцы п'есы выклікаў і разнабой у ігры актораў. У даным выпадку калектыў не здолеў праявіць сваіх творчых магчымасцей, хаця ў асобе Брэсцкага тэатра мы маем малады, але склаўшыйся творчы калектыў, які ўпарта авалодвае акторскім майстэрствам.

Спектакль «Слава» вучыць таму, што рэжысёр павінен выходзіць не з асабістага замыслу, а з замыслу аўтара, і чым глыбей будзе зразумета п'еса, тым цікавейшым будзе спектакль. «Слава» — лірыка-гераічная драма, у гэтым плане і трэба ставіць яе.

А. ЕСАКОЎ.

Трыццаць пяць год на сцэне

У маі гэтага года спаўняецца 35 год сцэнічнай дзейнасці Д. А. Аляксеенкі, артыста і рэжысёра Палескага абласнога імя Янкі Купалы драматычнага тэатра.

За трыццаць пяць год Даніла Аляксандравіч сыграў сотні ролей, ажыццявіў дзясяткі пастановак, вёў і вядзе ў тэатры педагагічную і грамадскую работу.

Творчай справаздачай тав. Аляксеенкі з'явіцца рыхтуемы ім спектакль «У стэпах Украіны» А. Карнейчука і выкананне ролі Галушкі.

М. ГАЛІН.



Заслужаная артыстка БССР Л. Ржэцкая. Гліна. Новая работа скульптара-ордэнаносца, засл. дзеяча мастацтваў БССР **З. Азгура.**

Фота І. Каплінскага.

„Любоў Яравая" на сцэне Слуцкага тэатра

За апошнія тры-чатыры месяцы Слуцкі калгасна-саўгасны тэатр падрыхтаваў і паказаў савецкаму гледачу рад актуальнейшых п'ес. Сярод іх выдатная п'еса М. Горкага аб апошніх днях рускага капіталізма «Егор Булычоў» і яркая камедыя К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» заслужана карыстаюцца вялікім поспехам у гледача.

Зараз тэатр паставіў п'есу К. Трэнёва «Любоў Яравая». Гэта п'еса аб рэвалюцыі і грамадзянскай вайне, аб савецкім патрыятызме, аб людзях двух светаў—людзях рэвалюцыі і людзях контррэвалюцыі — ужо рад год не сыходзіць з рэпертуару тэатраў.

Спектакль «Любоў Яравая» у Слуцкім тэатры прайшоў з вялікім поспехам. Артыстка Каменская стварыла праўдзівы вобраз чулай, простай жанчыны Любові Яравой.

Яшчэ ў ранняй маладосці Яравая моцна, горача пакахала чалавека-рэвалюцыянера. І вось пайшлі чуткі, што любы яе загінуў. А затым памерла і іх дзіця. Сваю вялікую любоў да мужа і дзіцяці Яравая пераносіць на рэвалюцыйную справу, якой, як здавалася Яравой, служыў і яе муж. І раптам яна зноў сустрэла свайго мужа. Ён не загінуў, а служыць у лагеры белых. Раней любімы ёю Яравы робіцца ёй чужым, жалкім у яе вачах чалавекам. Яна парывае ўсякую сувязь з ім і прадаўжае сваю рэвалюцыйную справу.

Яравы (артыст Арджанаў), у мінулым дробнабуржуазны рэвалюцыянер, стаў заклятым ворагам Савецкай улады. Ён, аднак, прадаўжае кахаць Яравую і прымае ўсе меры да таго, каб адарваць яе ад большэвікоў. Але ўсё марна. Тады Яравы ідзе на здрадніцтва і гаворыць Любові, што ён, Яравы, толькі з ёю, а значыць з большэвікамі, як думае Яравая. Для яе асабістае каханне і любоў да рэвалюцыі непадзельны.

Са здзіўляючай цеплынёй і шчырасцю праходзіць сцэна прымірэння Любові Яравой з мужам. Артыстка Каменская зразумела вобраз Яравой і стварыла яго пераканаўча і праўдзіва.

Артыст Арджанаў не знайшоў яшчэ ўсяго неабходнага, каб раскрыць да канца вобраз Яравога, заклятага ворага маладой сацыялістычнай рэспублікі. Ён некалькі пераігрывае, спрабуе стварыць з Яравога дэманічны вобраз, а гэта не адпавядае праўдзе.

Добра выканаў ролю старшыні рэўкома Рамана Кошкіна артыст Сцяпанаў. Просты, рашучы, умелы арганізатар, упэўнены ў сваёй праўдзе і перамозе,—гэткім павінен быць і гэткім ёсць Кошкін—Сцяпанаў. Для Кошкіна Савецкая ўлада — усё яго жыццё, ён і Савецкая ўлада неразадзельны. Калі Кошкін даведаўся, што адзін з яго сяброў-саратнікаў Гразной сваімі паводзінамі парочыць Савецкую ўладу, ён, ні на хвіліну не задумваючыся, бязлітасна распраўляецца з ім.

Пераканаўчы ў ролі Швандзі артыст Касач. Хвалююча глядзіцца сцэна вызвалення з-пад арышту Любові Яравой, калі Швандзя, апрануты ў афіцэрскую форму, пераконвае вартавога, хто ён: «Павінен ведаць, хам! Ці таксама ў чырвоныя глядзіш! Я табе паглядзжу!» і г. д.

Хочацца адзначыць шчырасць і праўдзівасць ігры артысткі Збароўскай у ролі Панавай, артыста Шапіры ў ролі Гарнастаева і артыста Талалуева ў ролі салдата Пікалава.

«Любоў Яравая» — добры спектакль, але над ім трэба яшчэ шмат працаваць. У прыватнасці, неабходна пазбавіцца празмернай мітусні ў 1 акце, вынайсці сугучны дзеянню рытм, палепшыць шумы: гарматныя стрэлы, кулямётную страляніну, сірэну, шум натоўпу, музыку ў кафе.

«Любоў Яравая» — удача тэатра. У сезоне 1941 года гэты спектакль, пры адпаведнай дапрацоўцы, будзе вядучым у Слуцкім тэатры.

А. ВАСІЛЬЕЎ.

Гастролі Вяземскага драмтэатра

21 красавіка пастаноўкай «Разбойнікі» Ф. Шылера пачаў свае гастролі ў гор. Вілейцы Вяземскі гарадскі драматычны тэатр. Першы спектакль меў вялікі поспех у гледачоў горада.

Калектыў тэатра прывёз з сабою багаты рэпертуар. У яго склад апрача «Разбойнікаў» уваходзяць: «Анна Карэніна», «Любоў Яравая», «Сантыментальны вальс», некалькі п'ес Астроўскага.

Ян СКАПАРСКІ.

Вілейка.

Больш увагі вясковым драмгурткам

Беластоцкі абласны Дом народнай творчасці правёў нараду кіраўнікоў самадзейных драматычных гурткоў, прысвечаную вынікам Усесаюзнага агляду тэатральнай самадзейнасці. Дырэктар ДНТ тав. Бейлінаў у вельмі цікавым дакладзе расказаў, што агляд выклікаў вялікае ажыўленне ў рабоце мастацкай самадзейнасці, у рэзультаце ў некалькі разоў узрос лік драмгурткоў. Многія з іх арганізаваліся ўжо ў перыяд агляду і за параўнаўча невялікі час змаглі паказаць узорныя прыклады работы, падрыхтаваць пастаноўкі, якія карысталіся ў грамадскасці заслужаным поспехам.

Так, драматычныя калектывы гор. Гродні і чыгуначнай станцыі Беласток паказалі на аглядзе спектаклі «Без віны вінаватыя» Астроўскага; рабочыя беластоцкага шклозавода з поспехам удзельнічалі ў аглядзе пастаўленай на польскай мове п'есай «Васса Жэлезнова» Горкага; гуртkoўцы тэкстыльнага камбіната ў Беластоку самі напісалі інсцэніроўку і паставілі спектакль па вядомай аповесці Ванды Васілеўскай «Аблічча дня»; рабочыя тэкстыльнага камбіната ў Васількове паказалі на яўрэйскай мове п'есу «Зямка Капач» Даніэля. Добра працуюць гурткі пры клубе шарцянікаў у Беластоку і ў гор. Бельску.

Аднак, дакладчык абмінуў работу вясковых драмгурткоў. Калі і ўпаміналіся на гэтай нарадзе (названай урачыста Першай абласной канферэнцыяй) некаторыя з іх, то толькі па Гродненскаму раёну. Усе астатнія раёны выпалі чамусьці з-пад увагі Дома народнай творчасці. Гэты асноўны недахоп у рабоце ДНТ яскрава пацвердзілі спрэчкі па дакладу. Замест таго, каб выслухаць патрабаванні перыферыйных і, галоўным чынам, вясковых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці, кіраўнікі нарады звялі ўсе спрэчкі да агульных, залішне прафесіянальных прамоў штатных работнікаў ДНТ і кіраўнікоў гарадскіх драматычных калектываў на тэму: як мы ставілі спектаклі. Ні адзін з кіраўнікоў вясковых гурткоў не выступіў на нарадзе, хоць, праўда, і было іх лічаных 2—3 чалавекі.

У вёсках былой Заходняй Беларусі, дзе яшчэ зусім нядаўна маглі толькі марыць пра свой клуб, школу, цяпер Савецкая ўлада стварыла ўсе магчымасці для радаснага і культурнага жыцця. Вось што расказвае дэпутат Капцёўскага сельскага савета, ініцыятар і кіраўнік мастацкай самадзейнасці ў вёсцы Капцёўка, Антон Міхайлоўскі:

— У нашай вёсцы раней толькі нямногія зналі, што такое кіно. Хто бываў у вялікім горадзе, ці служыў у салдатах, то траплялася бачыць. А ўся вёска і ўяўлення не мела. Цяпер-жа, за які год, перабывала ў нас столькі фільмаў, што і не ўпомніш. Яшчэ летась арганізавалі мы драмгурток. Падрыхтавалі і паставілі ўрывак з п'есы Якуба Коласа «У пушчах Палесся». Першы спектакль быў вялікай падзеяй для ўсёй вёскі. Цяпер, акрамя спектакляў сіламі моладзі, мы падрыхтавалі некалькі народных танцаў, развучылі песні аб вялікім Сталіне, Чырвонай Арміі, аб Чапаеве, аб танкістах і шмат народных беларускіх песень. Народныя песні дапамагаюць нам развучваць старэйшыя, якія шануюць і добра знаюць свае родныя песні. Бывае, на свята, ці ў нядзелю, як падрыхтуем канцэрт, дык не толькі што ўся наша вёска, а з усіх суседніх сёл прыходзяць паслухаць.

У гарадах, а асабліва ў Беластоку, не так цяжка, пры ўвазе літаральна ўсіх— і рэжысёраў, і актораў, і штатных метадыстаў, і клубаў—паставіць і Астроўскага і, калі хочаце, Шэкспіра. А вось у вёсцы, дзе гуртkoўцы самі і рэжысёры, і дэкаратары, і грымёры, дзе замест барады дзеду Талашу прычэпліваюць палойку лёну, а польскім афіцэрам вугалем малююць вусы,—там сапраўды патрэбна і ўвага і дапамога Дома народнай творчасці.

А гэтай увагі няма. Метадысты беластоцкага ДНТ не вельмі любяць ездзіць па вёсках. Лепей сядзець у кабінеце, пісаць інструкцыі, збіраць весткі і лічбы. Нават тая нясмелая крытыка, крытыка з прабачэннем, якая была ў часе абмеркавання даклада, паказала, што ў кіраўніцтве ДНТ пачынае ўкараняцца канцыляршчына. Кіраўнік Бельскага драмкалектыва расказвае, што калі-б ён ні прыехаў за якой парадай, то ніколі не даб'ецца адказу ў старшага метадыста тав. Бубрыка. То ў яго неадкладнае пасяджэнне, то спешная рэзалюцыя—і заўсёды «няма часу».

Мастацкая самадзейнасць—важнейшы ўчастак палітычна-выхаваўчай работы сярод працоўнага сялянства, якое цяпер актыўна ўключаецца ў сацыялістычнае будаўніцтва, і беластоцкі, ды і ўсе дамы народнай творчасці заходніх абласцей БССР павінны аддаваць ёй больш увагі, больш практычнай, дзелавой дапамогі. Яна па праву гэтага заслугоўвае.

Беласток. **(Наш кар.).**

В. ЦІМСКІ.



Нядаўна ў Мінску закончыліся арганізаваныя Філармоніяй БССР гастролі маскоўскага ансамбля балетнай мініяцюры пад мастацкім кіраваннем балетмейстара Э. Мэя. **На здымках:** злева — артыстка **В. Міронава;** справа — акрабатычны эцюд у выкананні артыстаў **В. Батыгінай, Е. Сяргеева, В. Міронавай, Л. Левіціна і Д. Орэхавай.**

Фота І. Каплінскага.



Тэатральная самадзейнасць БССР. Фінал спектакля «Чужы» Гордзіна ў пастаноўцы клуба работнікаў прамкааперацыі гор. Барысава (мастацкі кіраўнік Я. Левін). Злева направа: Калман-Мейша—рабочы арцелі «Праца» **Х. Брайштэйн,** Блюма — служачая хлебазавода **З. Мазо,** Беня — рабочы арцелі «Харчавік» **І. Яспэ,** Сора-Геня — механік арцелі «Праца» **Ф. Каўман,** Лілі — работніца арцелі «Праца» **С. Файберг,** Нафтоле-Герц — служачы завода імя Молатава **Я. Левін,** Піня — заг. клубам **Р. Фрыдман.**

Фота І. Каплінскага.

Пётр Чаадаеў

Да 85-годдзя з дня смерці

★

Л. Бараг

★

Бялінскі, Герцэн, Чаадаеў. Гэтыя тры імёны прадстаўляюць цэлую эпоху ў гісторыі рускай грамадскай мыслі. Чаадаеў, аднак, не быў, у адрозненне ад першых двух, ні крытыкам-публіцыстам, ні палітычным дзеячом. Яго «Філасафічнае пісьмо», якое, па словах Герцэна, усхвалявала ўсю Расію і зламала лёд пасля 14 снежня 1825 года, не прызначалася аўтарам для друку і трапіла ў журнал дзякуючы выпадку. І яшчэ задоўга да апублікавання гэтага пісьма Чаадаеў карыстаўся выключным уплывам на маладое пакаленне. «Ён у Рыме быў-бы Брут, у Афінах Перыклес»—так адзываўся ў 1816 годзе юны Пушкін аб 22-гадовым Чаадаеву, які служыў тады ў гусарскім палку ў Царскім сяле. Чаадаеў іграў не апошнюю ролю ў дзекабрысцкім Саюзе Благадзенствія, а пасля яго ліквідацыі ўступіў у 1821 годзе ў Паўночнае тайнае таварыства.

У 1823 годзе Чаадаеў паехаў за граніцу. Там ён пазнаёміўся з Шэлінгам, з якім падтрымліваў потым ажыўленую перапіску. У часе прабывання за граніцай Чаадаеў пачынае захапляцца шэлінгіянствам і праяўляе значную цікавасць да тагочасных каталіцкіх філосафаў, што было звязана з перажытым тады Чаадаевым вялікім душэўным пераломам. Трагедыя Чаадаева, які пацярпеў крах летуценняў аб «зорцы прывабнага шчасця», крах ілюзій аб разумных дзяржаўных рэформах, па сутнасці мала чым адрознівалася ад трагедыі Чацкага, якога фамусаўскае грамадства абвясціла вар'ятам.

Паражэнне дзекабрыстаў і наступіўшая следам за гэтым глухая рэакцыя ўтварылі на Чаадаева страшэннае ўражанне. Калі ўлетку 1826 года ён вярнуўся з-за граніцы, яго затрымалі «па высачэйшаму павяленню» на паўтара месяца ў Брэсце. Чаадаева абшукалі, з яго знялі допыт, які паказаў, што «ён мае самы недазволены лад мыслей». Так сустрэла філосафа Расія Нікалая Палкіна.

Аднойчы ў гутарцы з Герцэнам Чаадаеў сказаў: «У Маскве кожнага іншаземца водзяць глядзець вялікую гармату і вялікі звон... Гармату, з якой страляць нельга, і звон, які зваліўся раней, чым зазваніў. Здзіўляючы горад, у якім памятныя рэчы вылучаюцца бязглуздасцю, ці можа быць гэты вялікі звон без языка—іерогліф, які выражае велізарную нямую краіну...»

У канцы 20-х год Чаадаеў жыве жыццём кабінетнага вучонага і рэдка бывае ў грамадстве. Ён шукае забыцця ад гнятучай рэакцыйнай рэчаіснасці ў містыцызме і стварае сваю рэлігійна-філасофскую канцэпцыю. Але містыцызм зусім не быў асноўнай рысай светапогляду Чаадаева. Скрозь рэлігійную абалонку яго вучэння відаць здаровы грамадскі пачатак. Чаадаеў сцвярджаў, што гісторыяй кіруе бажэсцвены розум, а мэтай чалавецтва з'яўляецца свядомае і актыўнае ажыццяўленне волі гэтага розуму: стварэнне свабоднага грамадскага ладу. Эпохай антычнасці завяршаецца папярэдняе ўтварэнне роду чалавечага, але толькі ў эпоху хрысціянства,—гаворыць Чаадаеў, — калі духоўны інтарэс з'яўляецца кіруючым пачаткам і аб'ядноўвае ўсе народы Еўропы, чалавецтва становіцца на шлях безупыннага прагрэсу. Расія, адарваная на працягу многіх стагоддзяў ад Захаду, ніколькі не пасунулася па шляху пабудовы ідэальнага ладу і з'яўляецца прабелам у гісторыі чалавецтва.

Мінае некалькі год. Чаадаеў зноў паяўляецца ў арыстакратычным «вялікім свеце» і робіць спробу заняцца грамадскай дзейнасцю. Свае «Філасафічныя пісьмы» ён чытае ў маскоўскіх салонах і садзейнічае іх распаўсюджанню ў рукапісах. У 1836 годзе першае «Філасафічнае пісьмо» (пісьмо да Панавай) трапляе ў рукі Надзеждзіна і ён змяшчае яго ў № 15 свайго журнала «Телескоп».

Страшныя і жорсткія словы Чаадаева прагучалі, як «стрэл у цёмную ноч» (Герцэн). Пісьмо Чаадаева, надрукаванае ў «Телескопе», падрывала асновы тэорыі афіцыяльнай народнасці, згодна якой «мінулае Расіі было здзіўляючым, а сучаснае больш чым цудоўным». Гэта пісьмо разіла ўсіх тых, хто вольна ці міжвольна прымірыўся з турэмнай атмасферай царскай Расіі.

Перапалох і разгубленасць пасеяла чаадаеўскае пісьмо ва ўрадавых сферах. Журнал «Телескоп» быў забаронен, яго рэдактар саслан на Поўнач, а цэнзар, які прапусціў «Філасафічнае пісьмо», быў звολен з пасады і пазбаўлен чыноў. Па «высачэйшаму ўказу» было абвешчана, што Чаадаеў звар'яцеў, яму было загадана сядзець безвыходна дома і нічога не пісаць. Цэлы год падвяргаўся ён здзекам з боку паліцэйскага доктара, які быў прыстаўлен для нагляду за яго «душэўным станам».

У 1837 годзе Чаадаеў піша сваю выдатную «Апалогію звар'яцелага», якая была надрукавана за граніцай на французскай мове. У «Апалогіі» Чаадаеў ярка выразіў сутнасць сапраўднай любві да радзімы, любві з горда ўзнятай галавой і адкрытымі вачыма. К гэтаму часу погляды на гісторыю змяніліся (у параўнанні з 1829 годам, калі ён пісаў першае пісьмо). З расійскай адсталасці Чаадаеў робіць цяпер вывад аб асобым шляху развіцця Расіі, апярэджваючы ідэі Герцэна і народнікаў. Аднак, Чаадаеў да канца сваіх дзён застаўся інтэрнацыяналістам. Славянафільскае любаванне рускай адсталасцю было яму зусім чуждым.

Гнусная нікалаеўская рэчаіснасць скалечыла жыццё Чаадаева, але было бяссільна вытруціць яго благародныя пераканання. Пётр Якаўлевіч Чаадаеў увайшоў у гісторыю рускай філасофіі і літаратуры як адзін з самых яркіх і таленавітых мысліцеляў.

Шэкспір і Сервантэс у музыцы

23 красавіка мінула 325 год з дня смерці двух выдатных класікаў сусветнай літаратуры—Мігуэля Сервантэса і Вільяма Шэкспіра. Сотні год неўміручы створаныя імі вобразы і сотні год яны не перастаюць натхняць кампазітараў—служаць ім канвой для стварэння опернадраматычных і сімфанічных твораў. Многія з створаных такім чынам музычных твораў папаўняюць скарбніцу сусветнай музыкі, а многія... даўно забыты, як не адпавядаючыя сваім цудоўным літаратурным першакрыніцам.

* * *

Найбольш вядомыя музычныя ўвасабленні «Дон Кіхота», самага выдатнага твора Сервантэса, гэта балет Л. Мінкуса, гумарэска для аркестра А. Рубінштэйна і сімфанічная паэма Р. Штрауса (опера Мендэльсона «Вяселле Камачо» даўно не выконваецца).

Балет «Дон Кіхот», для якога раман з'явіўся толькі поводам пры стварэнні пампезнага балетнага свята з дэманстрацыяй віртуозных якасцей балерыны і танцоўшчыка, закранае ўсяго адзін эпізод «злых прыгод» героя—вяселле вясковай прыгажуні, якую Санчо Панса прадстаўляе свайму гаспадару ў якасці Дульсінеі. У балеце гэты эпізод некалькі змяняецца. Кітэрыя ператвараецца ў дачку тракцірышчыка, адбываецца яшчэ рад змяненняў сітуацый (што добра вядома мінскаму гледачу ў сувязі з пастаноўкай балета нашым тэатрам) і змест рамана некалькі выпустошваецца. Гэта тэма — «Вяселле Кітэрыі» альбо, як раней яе называлі — «Вяселле Гамаша», з 1809 года атрымлівала розныя музычныя ўвасабленні і толькі ў 1869 годзе канчаткова аформілася ў музыцы Л. Мінкуса. Па рытмічных якасцях музыка Мінкуса адпавядае свайму прызначэнню «балеткай», але адсутнасць іспанскага каларыту ў ёй, малая выразнасць прымушае пастаноўшчыкаў і дырыжораў спектакля шырока выкарыстоўваць у балеце «устаўныя нумары» розных кампазітараў.

Гумарэска для аркестра А. Рубінштэйна—адзін з каларытнейшых па мове, форме і інструментоўцы твораў кампазітара. Яна закранае рад эпізодаў рамана і носіць выяўленчы характар. Дон Кіхот прадстаўлен двума музычнымі характарыстыкамі: сурова-ваяўнічай і рамантычна-летуценнай, якія па-майстэрску выкарыстоўваюцца для кантрастаў і проціпастаўленняў з вясёлымі, смяючыміся сялянкамі, са статкам авечак і г. д. Твор заканчваецца смерцю героя.

У сімфанічнай паэме Р. Штрауса «Дон Кіхот» атрымаў найбольш поўнае і моцнае сваё ўвасабленне. Тут Дон Кіхот паказан у чыста філасофскім аспекце: дадзен свет душэўных перажыванняў рамантыка - утапіста, канфлікт ідэалу і рэчаіснасці. Штраус глыбока спачувае свайму герою, ён аплаквае яго, хаця ён майстэрска паказвае ў гратэскным выглядзе усе дзівацтвы Дон Кіхота, твор яго пранізан самым задушэўным лірызмам.

«Дон Кіхот» у Штрауса дадзен у выглядзе інтрадукцыі, 10-ці варыяцый і фіналу. Інтрадукцыя нібы тлумачыць змест раманаў, якімі зачытваўся Дон Кіхот. Далей ідзе тэма варыяцый—яна рысуе аблічча Дон Кіхота і Санчо Панса. Кожная варыяцыя—эпізод прыгод героя. Фінал паказвае апошнія дні яго ў аддаленні і смерць яго. Хаця твор грашыць натуралістычнымі прыёмамі — імкненнем да чыстай ілюстрацыйнасці накшталт бляяння бараноў, ужываннем прыбораў-інструментаў для паказу шуму ветракоў і таму падобных,—гэта адзін з лепшых праграмных твораў як па грандыёзнасці замыслу, так і па сродках выражэння. Багатая гарманічная мова, выключная тонкасць інструментоўкі, гранічна раскрываючая характарыстыкі ўсіх дзеючых асоб, тонкая псіхалагічная назіральнасць, якая дапамагае праўвасабленню «тэмы—характарыстыкі» ў адпаведнасці з сітуацыяй,—далёка не ўсе якасці гэтага твора.

* * *

Выкарыстанне кампазітарамі твораў Шэкспіра настолькі вялікае, што ў кароткіх рысах зусім немагчыма асвятліць гэту тэму; таму прыдзецца гаварыць аб найбольш выдатных работах.

Найбольш поўнае ўвасабленне ў сэнсе жанраў атрымала неўміручая трагедыя «Ромео і Джульета»: Белліні — опера, Берліоз—драматычная сімфонія, Чайкоўскі—сімфанічная паэма, Пракоф'еў — балет.

Хаця Белліні некалькі пераставіў акцэнт гэтага выдатнага твора, робячы яго не на тэме кахання, а на тэме родавых спрэчак (што адыграла поўную палітычную ролю ў справе аб'яднання Італьянскай дзяржавы, як залог яе нацыянальнай магутнасці) і з прычыны гэтага назваў сваю оперу «Монтэкі і Капулеці»,—твор яго глыбока пранізан рамантычным струменем (у межах італьянскай оперы) і поўны лірызму, што асабліва адчуваецца ў вобразе пяшчотнай, паэтычнай Джульеты.

Драматычная сімфонія Берліоза для сімфанічнага аркестра, хора і салістаў, прысвечаная Паганіні,—своеасаблівае opернае дзеянне ў канцэртным выкананні, з той толькі розніцай, што самая галоўная частка яго—раскрыццё драмы юных герояў—даецца і раскрываецца сімфанічным аркестрам, найбольш выдатнай зброяй гэтага выдатнага сімфаніста. Усю сілу перажыванняў герояў Берліоз увасабляе ў сімфанічнай частцы твора, выказваючы гэтым, што музыка—вышэй слова.

Сімфонія разбіта на сцэны: першая частка—інструментальны ўступ, за якім следуе сола (голас) і хор, — рысуе сутычкі двух родаў; другая частка—сцэна кахання Ромео і Джульеты, на фоне вечаровага змроку—сапраўдны аркестравы нактурн, поўны страсці і тамлення; чацвертая—пахавальная працэсія (пахаванне Джульеты) і сцэны ў склепе; пятая частка—фінал—адбываецца на могілках, дзе даецца клятва прымірэння. Маляўнічасць музычнай мовы, здзіўляючая аркестроўка, выключны лірызм — гэткія ўласцівасці гэтага выдатнага твора.

Сімфанічная паэма Чайкоўскага менш за ўсё прытрымліваецца выяўленчай ілюстрацыйнасці. Абрамлёная (па падказцы Балакірава) абшырнай інтрадукцыяй і кодай, рысуючай строгі вобраз пастара Ларэнца, тэма харальнага характару ў роўнай ступені можа існаваць і без праграмы,—гэта процістаўленне двух музычных вобразаў у санатнай форме, якія характарызуюцца двума музычнымі тэмамі: тэмай варожасці двух родаў і тэмай кахання. Чайкоўскі, наперакор Берліозу, адкінуў увесь тэатральны антураж. Пачынаючы з як-бы падслухоўваючай заказаных тэмы лёсу (альбо Ларэнца), увесь твор пранізан змрочным каларытам. Тэма варожасці ясна перадае «сутычкі» і «сабельныя ўдары»; тэма кахання—улюбёны кампазітарам і яркі ўзор мелодыі шырокага дыхання з рамантычным каларытам.

Балет кампазітара Пракоф'ева—глыбока псіхалагічны музычна-драматычны твор. Гэты твор настолькі глыбока перадае ў музыцы душэўныя імкненні шэкспіраўскіх герояў, што сама музыка, адарваная ад спектакля і шырока вядомая па двух аркестравых сюітах, пакідае незабыўнае ўражанне. Яркая мова Пракоф'ева, умелае пераўтварэнне мыслей—музычных тэм—багатымі гарманічнымі варыяцыямі, эмацыянальная, шматфарбная інструментоўка —усё спрыяе стварэнню не толькі адных лірычных вобразаў герояў, але і стварэнню ўсёй разнастайнасці душэўных перажыванняў усіх дзеючых асоб балета. Героі балета ахарактарызаваны музыкай у працэсе эвалюцыі іх мыслей і дзеянняў шматгранна.

Сваё найлепшае ўвасабленне «Отэлло» мела ў Расіні. У яго оперы шмат рамантызму, хаця ў годы яе стварэння апошні не меў шырокага ўжытку. Нават у сучасны момант такія элементы гэтай оперы, як песня Дэздэмоны «аб івушцы» (часта выконваецца ў канцэртах), песня гандальера і інш., з'яўляюцца прыкладам рамантычнага смутку і летуценнасці.

Надзвычай мелодычны «Отэлло» Вердзі, сугуба наватарскі твор па структуры оперных форм.

Творы Шэкспіра «Макбет», «Гамлет», «Кароль Лір» неаднаразова выкарыстоўваліся кампазітарамі: Тома, Берліозам, Чайкоўскім, Штраусам і нават Грыгам для напісання опер, сімфанічных паэм, проста музыкі да спектакляў і нават фартэп'янных п'ес, але шырокага прызнання ў музычнай грамадскасці яны не атрымалі, хоць «Макбет» з'яўляецца першай музыкальнай драмай вялікага Вердзі.

Шырокую папулярнасць у музыцы атрымаў «Сон у летнюю ноч» дзякуючы выдатнай музыцы Мендэльсона (уверцюра, нактурн, скерцо, вясельны марш).

«Бура» выкарыстана, па прапанове Стасава, Чайкоўскім для напісання сімфанічнай паэмы. У гэтым творы тое-ж пачуццё, той-жа музычны каларыт, які пранізвае і «Ромео і Джульету». Самая выдатная тэма гэтай паэмы—тэма кахання. Шырока паказан марскі пейзаж і бура. Звычайна лічаць, што па форме гэта мала ўдалы твор.

Камічны твор «Віндзорскія свавольніцы» знайшоў сваё выдатнае ўвасабленне ў оперы той-жа назвы кампазітара Отто Нікалаі. Пабудаваная па прынцыпу оперы-буфф, яна незвычайна мелодычная, гарэзлівая, з лёгка запамінаючыміся мелодыямі, стройная і закончаная па кампазіцыі.

Па матывах «Віндзорскіх свавольніц», з прыбаўленнем вестак з «Генрыха IV», кампазітарам Вердзі напісана выдатная лірычная камедыя «Фальстаф». Гэта апошняя опера Вердзі, у якой ён поўнасцю ажыццявіў свае оперна-рэфарматарскія пошукі—праблему рэалізма ў оперным мастацтве. Скразное музыкальнае дзеянне (адсутнасць «нумароў»), гібкая дэкламацыйная мова, выдатная аркестроўка, дасціпнасць і бляск—усё гэта робіць камедыю «Фальстаф» надзвычай займальнай, а па структурных асаблівасцях і сродках выражэння дае магчымасць ставіць яе побач з такімі творамі Вердзі, як «Макбет» і «Отэлло»

«Шмат шуму з нічога» — апошняя камічная опера Берліоза. З-за баязні кпінаў, прыйшлося толькі кампазітару перайменаваць яе ў «Беатрысу і Бенедыкта»—па імені галоўных дзеючых асоб.

Малады таленавіты савецкі кампазітар Хрэннікаў афарміў сваёй музыкай драматычную пастаноўку «Шмат шуму з нічога». Выдатна тонка схопленыя, галоўным чынам гумарыстычныя, характарыстыкі гэтага музычнага афармлення дазваляюць уключаць іх у канцэртную праграму ў выглядзе асобных нумараў.

Такі кароткі агляд выкарыстання ў музыцы твораў двух найвялікшых пісьменнікаў свету.

С. НІСНЕВІЧ.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.